ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
7 КРАСАВІКА 2016 г. ЧАЦВЕР № 64 (28174) Кошт 2100 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Самы ветлівы баксёр на рынгу



Знайсці працу мары



Анёл з моцным духам

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Жанна ВАСІЛЕЎСКАЯ, намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта:**

*«У апошнія гады ў нас захоўваецца станоўчая дынаміка нараджальнасці. Так, узровень нараджальнасці застаецца нязменным на працягу трох гадоў і складае 12,5 на 1000 чалавек насельніцтва. У 2015 годзе самы высокі паказчык адзначаны ў Брэсцкай і Мінскай абласцях (13,5). Пры гэтым летась адзначана максімальная колькасць нараджэнняў за апошнія пяць гадоў — больш за 119 тысяч дзяцей. Гэта амаль на 500 дзяцей больш, чым у 2014-м, і на 11 тысяч больш, чым у 2010-м. Па колькасці нованароджаных лідзіруе сталіца: у Мінску летась нарадзілася амаль 23 тысячы дзяцей — кожнае пятае дзіця».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.04.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20236,00 | ▼ |
| Еўра | 22977,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 295,36 | ▲ |
| Укр. грыўня | 780,67 | ▲ |

# САЛОДКІ КРАСАВІК



**Красавіцкі час для работнікаў Уздзенскага лясгаса адметны тым, што на дзялянках з бярозавымі пасадкамі поўным ходам ідзе нарыхтоўка соку. Усе шэсць лясніцтваў абавязаліся нарыхтаваць за сезон 360 тон гэтага карыснага і смачнага напою. На сённяшні дзень першыя 100 тон бярозавіку адпраўлены на перапрацоўчыя прадпрыемствы і рэалізаваны насельніцтву. На красавіцкай дзялянцы ў Лашанскім лясніцтве чацвёрты год працуюць нарыхтоўшчыкі Віталь ШУБА і Сяргей МІХЕД.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

■ Адпачынак-2016

## ЛЯЦІМ ДА МОРА?

На першых месяцах сярод папулярных турыстычных краін для беларусаў — Егіпет і Балгарыя



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Як адрэагаваў турыстычны рынак на сусветныя падзеі? На якія замежныя краіны сёлета нашы турысты больш звяртаюць увагу і ці варта чакаць павелічэння патоку ўязнога і ўнутранага турызму? Якія новыя турыстычныя прадукты можа прапанаваць цяпер наша краіна і якія меры прымаюцца для спрашчэння візавага рэжыму паміж Беларуссю і іншымі дзяржавамі? На гэтыя і іншыя пытанні падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА адказвалі намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Міхаіл ПАРТНОЙ і начальнік філіяла «Белінтурыст» РУП «Цэнтркурорт» Аляксей СТРЭЛЬЧАНКА.**

### ТУРЦЫЯ БОЛЬШ НЕ Ў ФАВОРЫ

Міхаіл Партной адзначыў, што, па ацэнцы спецыялістаў, сёлетні ТОП-10 для нашых суайчыннікаў — гэта Егіпет, Балгарыя, Чарнагорыя, Грузія, Іспанія, Турцыя, Крым, Тайланд, Канарскія астравы і Грэцыя. І гэта пры тым, што эксперты міністэрства рэкамендавалі нашым патэнцыйным спажыўцам устрымацца ад паездак у Егіпет. Але, мабыць, крытэрыі «кошт-якасць» адыгрываюць сваю ролю. Тут трэба звярнуць увагу, што ў дзясятцы з'явіліся новыя гульцы ў параўнанні з 2015-м. Гэта Чарнагорыя, Грузія і Канарскія астравы. Раней турэцкі кірунак быў абавязкова ў лідарах (у 2014-м ён займаў першае, а летась — другое месца).

СТАР. 4

■ Веснавы марафет

## ГЕНЕРАЛЬНАЯ ПРЫБОРКА

**Як камунальнікі наводзяць чысціню і стымулююць мінчан выконваць правілы**

**Прыйшла вясна, з-пад снегу паказаліся недакуркі, пластыкавыя бутэлькі і іншае смецце... Думаеце, смешна? А вось работнікам камунальных службаў зусім не да смеху. І калі гараджане часам не заўважаюць іх штодзённай працы, а то і наракаюць на яе якасць, то вельмі хутка заўважаць яе адсутнасць, калі, напрыклад, у двары не будуць прыбірацца хоць бы тыдзень.**

### Рамонт дарог — па конкурсе

Між тым адказнасць за беспарадак на вуліцах і ў пад'ездах нясуць перадусім не камунальнікі, а мы самі, грамадзяне, кідаючы іншы раз паперку міма сметніцы. Таму камунальныя службы заклікаюць мінчан не толькі не смеціць, але і дапамагаць у прыборцы. Асаблівая дапамога жыхароў патрэбна цяпер, падчас месячніка па добраўпарадкаванні, які праходзіць у сталіцы з 15 сакавіка да 15 красавіка.

— На сённяшні дзень прыведзена ў парадак больш за 40% тэрыторый. Нягледзячы на ўмовы надвор'я, запланаваныя работы мы выконвалі, — паведаміла **выканаўца абавязкаў начальніка ўпраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Марына МАЛАЕВА**.

Сярод запланаваных мерапрыемстваў — ямачны рамонт дарог, пасадка дрэў, рамонт дзіцячага гульнявога абсталявання.

Усе раёны сталіцы абвясцілі конкурсы на выбар падрадных арганізацый па ямачным рамонце дарог. Конкурсы ўжо правялі Першамайскі і Цэнтральны раёны, на падыходзе Фрунзенскі.

— Мы заяўляем аб'ёмы грошай, якія ў нас ёсць, і людзі, што ўдзельнічаюць у электронных таргах, канкурыруюць паміж сабой, — патлумачыла **намеснік генеральнага дырэктара Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Галіна ГІЛЕВІЧ**.

СТАР. 3

## УСЕБЕЛАРУСКІ СХОД АДБУДЗЕЦЦА Ў КРАСАВІКУ

### Яго дакладную дату вызначыць аргкамітэт

**Пра гэта паведаміў Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі, на першым пасяджэнні рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні V Усебеларускага народнага сходу.**

— Гэта знакавае палітычнае мерапрыемства, — лічыць кіраўнік кабінета міністраў. — Яно азначае сабой не толькі канец пяцігадовага перыяду развіцця краіны, але, з улікам сённяшніх геапалітычных і эканамічных рэалій, пачатак новага этапу ў жыцці як нашага грамадства, так і дзяржавы ў цэлым.

Распараджэннем Прэзідэнта створаны рэспубліканскі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні V Усебеларускага народнага сходу. У ім кіраўнік дзяржавы паставіў шэраг задач, рашэнне якіх патрабуе ад камітэта аператыўнай суладнай працы, падкрэсліў кіраўнік Саўміна.

«Самае галоўнае — да 15 красавіка мы павінны прадставіць кіраўніку дзяржавы праект асноўных палажэнняў праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016-2020 гады», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Па словах Андрэя Кабякова, праект праграмы — гэта базавы прагнозны дакумент, у якім будуць вызначаны мэтавыя арыенціры і ключавыя параметры развіцця краіны на бягучую пяцігодку і які традыцыйна выносіцца на разгляд Усебеларускага народнага сходу. Для яго распрацоўкі створана міжведамасная рабочая група пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіла Мясніковіча.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## УДЗЕЛ КОЖНАГА

### будзе ўлічаны пры распрацоўцы праграмы развіцця краіны

**Пра гэта паведаміў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, на пасяджэнні міжведамаснай рабочай групы па распрацоўцы Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016-2020 гады.**

— Дзейнасць групы будзе насіць адкрыты характар, — падкрэсліў спікер верхняй палаты беларускага парламента. Мы ўжо пачалі адпаведную работу: у сакратарыяце Савета Рэспублікі адкрылі прамую лінію сувязі, на якую могуць звярнуцца ўсе ахвотныя.

Міжведамасная рабочая група па распрацоўцы праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016-2020 гады была створана па даручэнні Прэзідэнта і мусіць да 15 красавіка падрыхтаваць праект асноўных палажэнняў праграмы. Для таго, каб праца была больш эфектыўнай, у групе арганізавана чатыры секцыі: макраэканоміка, фінансы і грашова-крэдытная палітыка; інавацыйнае развіццё; матэрыяльная вытворчасць; сацыяльная палітыка.

«Трэба прымаць рашэнні зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў. У першую чаргу ў сферы матэрыяльнай вытворчасці», — лічыць парламентарый. А калі будзе эфектыўна працаваць рэальны сектар эканомікі, тады будзе і годны ўзровень заробкаў і пенсій, сродкі на ахову здароўя і сацыяльныя праграмы ў цэлым. Але зараз, на думку сенатара, у праграме шмат агульных слоў і мала канкрэтных лічбаў, няма рэгіянальнага зрэзу па паказчыках:

— Краіна павінна бачыць рубяжы 2020 года ў канкрэтных лічбах, а не толькі ў прыгожых тэзісах. Трэба разлічыць тэндэнцыі развіцця, якая будзе структура эканомікі, а менавіта арыенціры для апрацоўчай прамысловасці, аграпрамысловага комплексу, будаўнічай галіны, якая іх удзельная вага ў валавым унутраным прадукце, якім чакаецца жыццёвы і пенсійны ўзровень грамадзян на канец пяцігодкі, як будзе забяспечацца занятасць працаздольнага насельніцтва.

Па словах **намесніка міністра эканомікі Дзмітрыя КРУТОГА**, у бліжэйшую пяцігодку эканоміка нашай краіны «захавае сваю сацыяльную арыентацыю». «Рост рэальных наяўных даходаў насельніцтва будзе прадвызначацца дынамікай ВУП, прадукцыйнасцю працы і складзе не менш як 110% за пяцігоддзе», — заявіў ён. Дапрацаваным праектам праграмы прадугледжаны рост ВУП на 0,3% і рост эканомікі Беларусі на 10,1%, што ў 1,7 раза вышэй, чым у мінулыя пяць гадоў.

***Прапановы па праекце праграмы прымаюцца па тэлефоне 8-017-327-25-68. Па ім паведамленні можна рабіць у працоўныя дні з 10.00 да 20.00, па суботах — з 10.00 да 15.00. Таксама на сайце Савета Рэспублікі будзе пазначаны адрас электроннай пошты, на які можна будзе накіраваць ліст з ідэямі па развіцці краіны.***

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

## НАШУ КРАІНУ ДОБРА ВЕДАЮЦЬ У СВЕЦЕ

### Нават у Замбіі



**У Замбіі, афрыканскай краіне, якая знаходзіцца ледзь не на іншым канцы свету ад Беларусі, праходзіла 134-я Асамблея Міжпарламенцкага саюза. Гэта міжнародная арганізацыя, якая на сваім пачатку была створана для вырашэння менавіта палітычных пытанняў, а сёння заклікана ідэйна яднаць і каардынаваць парламенты ўсяго свету. Пра тое, як прайшла сусветна значная сустрэча, «Звяздзе» расказала Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.**

У працы асамблеі Святлана Міхайлаўна ўдзельнічала ў складзе дэлегацыі Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі разам з Віталём Бусько, старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Беларусі і намеснікам старшыні Парламенцкага сходу.

Па словах сенатара, 134-я Асамблея Міжпарламенцкага саюза — вельмі важная палітычная падзея. У цырымоніі адкрыцця браў удзел прэзідэнт Замбіі Эдгар Лунгу. Асноўнымі тэмамі, пра якія гаварылі парламентарыі больш як са 170 краін свету цягам чатырох дзён, сталі ўдзел моладзі ў справах дзяржавы, ахова і захаванне культурнай спадчыны, міжнародная бяспека і барацьба з тэрарызмам. Апошняя тэма набыла асаблівую актуальнасць у сувязі з нядаўнімі выбухамі ў Брусэлі.

Падчас адкрыцця асамблеі пра нашу краіну прадставіла Святлана Герасімовіч, яна распавяла пра ўдзел моладзі ў парламенцкім руху. Замежнікі былі шчыра здзіўлены, калі даведаліся, што ў Беларусі бясплатныя медыцына, адукацыя, гурткі і секцыі для дзяцей, створаны спецыяльны фонд Прэзідэнта па падтрымцы таленавітых маладых людзей.

Парламентарый падкрэсліла, што імкненне моладзі да дэмакратыі натуральнае, і не менш натуральным з'яўляецца яе імкненне да моцнай дзяржавы, здольнай рэагаваць на сучасныя выклікі і пагрозы, эфектыўна вырашаць сацыяльныя праблемы. У Беларусі цяпер працуе 35 маладзёжных парламентаў, у якіх маладыя людзі могуць сябе праявіць. Парламенты былі арганізаваны па ініцыятыве саміх хлопцаў і дзяўчат і дзейнічаюць пры ўсіх абласных Саветах дэпутатаў і пры некаторых ВНУ. Ужо ў маладым узросце юныя парламентарыі распрацоўваюць уласныя грамадскія праекты і ажыццяўляюць іх.

«Трэба аддаць належнае, нашу краіну ў свеце пазнаюць», — дзеліцца ўражаннямі парламентарый. Па яе словах, удзельнікі дэлегацый з Амана, Францыі і Кітайскай Народнай Рэспублікі ведаюць нашу краіну, бывалі ў ёй і плённа супрацоўнічаюць.

У рамках асамблеі адбыўся шэраг двухбаковых сустрэч прадстаўнікоў Беларусі, у тым ліку з прэзідэнтам МПС Саберам Чаўдхуры, генеральным сакратаром Міжпарламенцкага саюза Марцінам Чунгонгам, старшынёй Пастаяннага камітэта па міжнародных справах Нацыянальнай асамблеі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Тран Ван Гангам, а таксама з прадстаўнікамі дэлегацый Расіі, Украіны, В'етнама, Сербіі, Тайланда, Кітая, Швецыі, Польшчы, Амана, Турцыі, Францыі і іншых. Абмяркоўваліся перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва. Асаблівая ўвага была нададзена ўзаемадзеянню рэгіёнаў.

У адзін з дзён асамблеі засядала геапалітычная група «Еўразія» Міжпарламенцкага саюза. На пасяджэнні абмяркоўвалі пытанні саюзнага будаўніцтва, супрацоўніцтва беларускіх і расійскіх сродкаў масавай інфармацыі і развіццё агульнай інфармацыйнай прасторы, а таксама падрыхтоўку да Трэцяга форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбудзецца ў чэрвені гэтага года ў Мінску.

Расійскі бок прапанаваў наступную асамблею правесці ў Санкт-Пецярбургу, прыводзячы як аргумент прыгажосць горада і яго эканамічную прывабнасць. «Калі слова далі мне, вырашыла прадставіць Беларусь, расказала пра нашы культурныя славутасці, створаны спрыяльны для развіцця бізнесу інвестыцыйны клімат, пра спакой на нашай зямлі без войнаў», — падсумоўвае Святлана Міхайлаўна, якая з'яўляецца членам Пастаяннай камісіі па вывучэнні вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання МПС СНД.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by* ■

## ПРАФСАЮЗ ДАПАМОГ ВЯРНУЦЬ ГРОШЫ

Прадавец аднаго з магілёўскіх магазінаў засталася без заробку. Прычына — выяўленая падчас рэвізіі нястача. Пакрыўджаная жанчына пайшла шукаць праўды ў абласное аб'яднанне прафсаюзаў. І, як высветлілася, недарэмна. Юрысты хутка знайшлі шэраг парушэнняў нормаў беларускага заканадаўства аб працы, якія дапусціў наймальнік. У адпаведнасці з Працоўным Кодэксам, ён павінен быў папярэдзіць работніка наконт утрымання грошай не пазней 2 тыдняў пасля выяўлення прычыненай ім шкоды і запатрабаваць тлумачэнне. Але ён праігнараваў гэта патрабаванне. Як і тое, што сума спагнання не павінна была складаць больш за 50% заробку.

Жанчына была азнаёмлена са сваімі правамі, а галоўны прававы інспектар працы абласнога аб'яднання прафсаюзаў Іна Чабатарэўская дапамагла ёй скласці іскавую заяву ў суд. Але да гэтага справа не дайшла. Наймальнік прызнаў парушэнні, адмяніў загад і выплаціў жанчыне заробак, які ёй належаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

### по объекту «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова. Жилой дом № 7 по генплану»

**Сведения о застройщике.**

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад», зарегистрированное Мингорисполкомом 05.01.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192400611.

Юридический адрес: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 4-107, тел./факс 234-16-99, тел. 234-16-98. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты: жилые дома № 6, 8, 10, 14 по ул. Каролинской; жилой дом № 4 по ул. С.Есенина; жилой дом № 14а по ул. Короля; жилые дома №№ 12, 16, 22 по ул. Чюрлёниса; жилой дом № 6 по ул. С. Есенина.

Цель проекта – строительство объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова. Жилой дом № 7 по генплану».

Начало строительства объекта – март 2016.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию – сентябрь 2016.

Государственная экспертиза проектной и сметной документации: заключение РУП «Госстройэкспертиза» от 30.09.2015 № 699-15/15.

Земельный участок передан коммунальному унитарному дочернему предприятию «Управление капитального строительства Запад» решением Мингорисполкома от 22.01.2016 № 68.

Разрешение Инспекции Госстройнадзора по г. Минску на производство строительно-монтажных работ – от 23.03.2016 № 2-203Ж-007/16, от 31.03.2016 № 2-203Ж-007/16.

Генеральный подрядчик – ОАО «Минский домостроительный комбинат» (договор строительного подряда № 1-2016 от 11.03.2016).

Жилой дом запроектирован 10-этажным, односекционным в конструкциях серии ЗА-ОПБ крупноблочных жилых домов, с техническим подпольем, теплым чердаком, под лоджиями первого этажа предусмотрены хозяйственные погреба. Всего квартир – 100, в том числе: 1-комнатных – 41, 2-комнатных – 59. Общая площадь квартир – 5396,11 кв.м.

Отделка наружных стен – акриловые фасадные краски, покрытие защитно-декоративным полимерным составом. Остекление лоджий – ПВХ с одинарным остеклением. Окна и балконные двери – деревянные с двухкамерным стеклопакетом. Предусмотрен лифт грузоподъемностью 1000 кг, мусоропровод, поквартирный учет холодной и горячей воды, электроэнергии и тепла, устройство внутриквартирного пожаротушения. Квартиры оборудованы автономными пожарными извещателями.

Проектом предусмотрена внутренняя отделка помещений.

В состав общего имущества объекта входят лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, кровля, технические и подвальные этажи, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений.

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 5,1% общей площади жилого дома.

Согласно решению Мингорисполкома от 03.03.2016 № 599 строительство жилых помещений будет осуществлено с привлечением граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, по направлениям администраций районов г. Минска.

**Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 95 (девяносто пять) квартир, в том числе:**

- 39 (тридцать девять) 1-комнатных общей площадью от 38,03 до 42,96 кв.м;
- 56 (пятьдесят шесть) 2-комнатных общей площадью от 56,05 до 66,66 кв.м.

Стоимость 1 кв.м общей площади объекта долевого строительства на день опубликования проектной декларации в текущих ценах с учетом прогнозных индексов для нормативной площади – 12 136 391 рубль, для площади, превышающей нормативную – 15 994 462 рубля.

**Условия оплаты –** первоначальный взнос в размере 30% стоимости объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – до конца строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор,
- направление администрации района г.Минска на долевое строительство,
- справка о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Документы для заключения договоров будут приниматься **с 12.04.2016 по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, каб. 1, тел.: (017)234-16-98, (044)795-44-44.**


■ Тыдзень лесу — 2016

Віктар ГУМІНСКІ:

## «МЫ ЗА ДЗЕНЬ ПАСАДЗІМ 12 ТЫСЯЧ ДРЭЎ!»

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прынялі ўдзел у добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу — 2016», якая праводзіцца з 2 па 9 красавіка пад патранажам Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Мерапрыемства праходзіла ў Задор'еўскім лясніцтве Лагойскага лясгаса. Тут любы ахвочы мажа пасадзіць дрэва, закласці дэндрапарк, уласнаручна стварыць алею або проста дапамагчы навесці парадак у лесе.**

«Каля 40 працэнтаў тэрыторыі нашай краіны займаюць лясы. Беларусы павінны клапаціцца пра гэтае багацце і не толькі яго берагчы, але і памнажаць. Менавіта ў гэтым і заключаецца галоўная мэта такой акцыі, — адзначыў **Віктар ГУМІНСКІ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.** — Дэпутаты парламента заўсёды адгукаюцца на заклікі Міністэрства лясной гаспадаркі, і вось ужо восьмы год запар мы прымаем удзел у гэтым мерапрыемстве. Вельмі прыемна бачыць плён сваёй працы: дрэвы, якія дэпутаты пасадзілі тут у 2009 годзе, ужо вышэйшыя за нас. Кажуць, што за жыццё чалавек павінен пасадзіць хаця б адно дрэва — мы ж за дзень пасадзім каля 12 тысяч!»

Сёлета акцыя прысвечана 30-годдзю з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Добраахвотнікі высаджваюць дрэвы ў гонар удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы. Плануецца правесці памятныя пасадкі сквераў і алей, а таксама добраўпарадкаванне тэрыторый мемарыяльных комплексаў.

«Акцыя «Тыдзень лесу» была ўпершыню праведзена ў 1924 годзе — гэтую інфармацыю мы знайшлі ў архівах Міністэрства лясной гаспадаркі, — паведаміў **Аляксандр КУЛІК, першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.** — Некалькі гадоў яна паспяхова ажыццяўлялася, аднак пасля гэтага праводзіцца перастала. У 2007 годзе мы адрадзілі мерапрыемства, якое стала цяпер ужо традыцыйным. Сімвалічна, што сёння дрэвы саджаюць дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, бо менавіта сёлета стаў паўнавартасна працаваць Лясны кодэкс — дакумент, у якім улічаны ўсе патрэбы жыццядзейнасці лесу».

У гэтым годзе ў акцыі «Тыдзень лесу — 2016» возьмуць удзел каля 80 тысяч чалавек. Штогод дзякуючы гэтаму мерапрыемству ствараецца 24 тысячы гектараў лясных культур — па 5 тысяч дрэў на адзін гектар. «Гэта сведчыць пра тое, што лес у нас не толькі высякаецца, але і стабільна аднаўляецца», — дадаў першы намеснік міністра.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ** ■

# ЭФЕКТЫЎНЫ ІНСТРУМЕНТ

## «Эталон-стандарт» — прававая і тэхнічная інфармацыя ў рамках адзінага інфармацыйнага рэсурсу




**У краіне запусцілі ўнікальны інфармацыйны рэсурс «Эталон-стандарт», які забяспечвае доступ да тэхнічнага заканадаўства любой дзяржавы. Гэты рэсурс з'яўляецца сумеснай распрацоўкай Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (НЦПІ) і Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС).**

«Эталон-стандарт» прадастаўляе адзіны доступ да дакументаў эталоннага банка даных прававой інфармацыі рэспублікі, матэрыялаў правапрымяняльнай і судовай практыкі, а таксама да дакументаў камп'ютарнага банка даных Нацыянальнага фонду тэхнічных нарматыўных прававых актаў (ТНПА). Сярод іх — прававыя акты, якія складаюць заканадаўства Рэспублікі Беларусь; міжнародныя дагаворы; судовыя рашэнні і акты пракурорскага нагляду; ТНПА, у тым ліку тэхнічныя рэгламенты, дзяржаўныя стандарты, санітарныя правілы і нормы і іншыя дакументы; афіцыйныя каментары і тлумачэнні па ўжыванні тэхнічнага заканадаўства і інш.

Як кажуць самі спецыялісты, такое шырокае інфармацыйнае напаўненне з'яўляецца найважнейшай перавагай новага рэсурсу, дазваляе скарацідь затраты на пошук і атрыманне неабходнай інфармацыі, забяспечвае комплекснасць яе прадастаўлення, павышае эфектыўнасць выкарыстання дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў, павялічвае ступень інфармаванасці розных катэгорый карыстальнікаў. «Эталон-стандарт» стане эфектыўным і незаменным інструментам у юрыдычнай, эканамічнай, сацыяльнай сферах, навукова-тэхнічнай і вытворчай дзейнасці.

Сумесны рэсурс аб'яднаў два дзейныя банкі даных, сфарміраваных НЦПІ і БелДІСС: эталонны банк прававой інфармацыі і камп'ютарны банк даных Нацыянальнага фонду ТНПА.

— Сёння мы можам прапанаваць такую магчымасць, што пры дапамозе аднаго кліка можна ўбачыць патрабаванні, якім павінна адпавядаць прадукцыя або паслуга, і пры гэтым разумець, якія прававыя нормы павінны быць забяспечаны пры іх выпуску, — тлумачыць **дырэктар БелДІСС Ірына АСМОЛА**. — «Эталон-стандарт» спалучае дзве платформы: тэхнічную і прававую інфармацыю, што вельмі зручна для розных катэгорый карыстальнікаў.

**Намеснік дырэктара НЦПІ Віктар ШАРШУНОЎ** адзначыў, што выкарыстанне новага рэсурсу дасць магчымасць павысіць эфектыўнасць рашэнняў, якія прымаюцца як для дзяржаўных органаў у сферы дзяржаўнага кіравання, так і ў сферы гаспадарчай дзейнасці для суб'ектаў гаспадарання. «Стварэнне такога рэсурсу з'яўляецца чарговым крокам да фарміравання адзінай інфармацыйнай прасторы на шляху нашай краіны да інфармацыйнага грамадства», — падкрэсліў ён.

Створаны «Эталон-стандарт» з'яўляецца першым сумесным крокам НЦПІ і БелДІСС па далейшым развіцці адзінай інфармацыйна-прававой прасторы Беларусі.

Інфармацыйны рэсурс даступны як карыстальнікам персанальных камп'ютараў, так і мабільных прылад, падтрымліваецца ўсімі асноўнымі браўзерамі.

**Дар'я ШОЦІК.**

# УВАГА, ПРАМЫЯ ЛІНІІ

## Падатак на працэнты, нюансы арэнды кватэр і іншае

**12 красавіка**, у аўторак, у рэдакцыі газеты «Звязда» адбудзецца **«прамая лінія» з начальнікам галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі**

### Міхаілам Міхайлавічам РАСОЛЬКАМ

З першых дзён красавіка ў краіне пачалі дзейнічаць асобныя падпункты Дэкрэта кіраўніка дзяржавы №7 «Аб прыцягненні грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты)», якія рэгулююць парадак падаткаабкладання даходаў па банкаўскіх укладах (дэпазітах), а таксама грашовых сродках, якія знаходзяцца на бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку.

Пытанні, якія тычацца гэтых новых правілаў, нюансаў у падаткаабкладанні даходаў ад здачы кватэр у арэнду, а таксама ўсяго іншага, што звязана з падаткаабкладаннем фізічных асоб, можна будзе задаць **12 красавіка з 11 да 12 гадзін па тэлефоне (8-017) 287-18-71**.

## Аб тэхнічнай інвентарызацыі і зямельных пытаннях

**13 красавіка**, у сераду, у рэдакцыі газеты «Звязда» адбудзецца **«прамая лінія» са старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі**

### Андрэем Анатолевічам ГАЕВЫМ

Такім чынам, новыя правілы тэхнічнай інвентарызацыі і праверкі характарыстык нерухомай маёмасці ўступілі ў сілу сёлета з першых дзён красавіка. Адпаведная Інструкцыя была зацверджана 24 сакавіка 2015 года пастановай Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь №11.

Пытанні, якія тычацца гэтых новых правілаў, нюансаў ацэнкі дамоў і зямельных участкаў, а таксама ўсяго іншага, што звязана з зямельнымі надзеламі фізічных асоб, можна будзе задаць **13 красавіка з 12 да 13 гадзін па тэлефоне (8-017) 287-18-71.**

Папярэдне свае пытанні можна пакінуць **па нумары (8-017) 287-17-51** альбо даслаць на **электронную пошту kurkach@zviazda.by** з пазнакай «Прамая лінія».

■ Разумнікі і разумніцы

# Алімпіядны рух: 600 тысяч удзельнікаў

**Спецыяльны прыз міністра адукацыі атрымалі 17 пераможцаў рэспубліканскіх прадметных алімпіяд. У краіне на мінулым тыдні завяршыўся інтэлектуальны марафон.**

Усяго ў заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах прыняла ўдзел амаль 1,5 тысячы навучэнцаў з усіх рэгіёнаў Беларусі. А ва ўсіх турах прадметных алімпіяд — ад школьнага да рэспубліканскага — свае веды па 17 вучэбных прадметах прадэманстравалі каля 600 тысяч юнакоў і дзяўчат з устаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Рэспубліканскі тур алімпіяды прымалі Дзяржынск (руская мова і літаратура), Полацк (беларуская мова і літаратура), Гродна (гісторыя, грамадазнаўства), Барысаў (геаграфія), Віцебск (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская мовы), Гомель (матэматыка, фізіка, астраномія), Мінск (біялогія, хімія), Магілёў (інфарматыка) і Жодзіна (працоўнае навучанне).

— У пастаяннай падрыхтоўцы вучняў да алімпіяд самага рознага маштабу — ад школьных да рэспубліканскіх і міжнародных — задзейнічаны найлепшыя педагогі школ, ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў нашай краіны. Але галоўнае, на што нацэлены інтэлектуальныя спаборніцтвы, іх асноўная, глыбінная мэта — гэта павышэнне цікавасці вучняў да прадметаў, якія вывучаюцца, развіццё іх творчых здольнасцяў, паглыбленне тэарэтычных ведаў і практычных уменняў, — падкрэслівае **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**.

Пераможцы рэспубліканскага тура алімпіяды па традыцыі ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II і III ступені і прызамі міністра адукацыі. Пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці ў ВНУ яны залічваюцца без уступных іспытаў. Пераможцаў заключнага этапу алімпіяды, а таксама педагогаў, якія іх падрыхтавалі, прадстаўяць да заахвочвання прэміямі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

Да таго ж гэтым летам пераможцы заключнага рэспубліканскага тура будуць абараняць гонар беларускай школы на міжнародных спаборніцтвах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ А не шкодзь!

# І ВОСЦЯМІ, І СЕТКАМІ, І БАГРЭННЕМ...



**Напярэдадні нераставага сезона дзяржінспектары зрабілі акцэнт у сваёй працы на выяўленне парушэнняў у сферы рыбалоўства. Бо, нягледзячы на трохразовыя таксы, па якіх плаціць у гэты перыяд кожны парушальнік, ахвотнікаў пажывіцца лёгкай здабычай, на жаль, хапае.**

— Браканьера з вёскі Чудзін Ганцавіцкага раёна гэтай вясной ужо тройчы затрымлівалі дзяржінспектары Салігорскай і Нясвіжскай міжрайінспекцый. І кожны раз — на Чырвонаслабодскім вадасховішчы. Пажылы мужчына неаднаразова прыцягваўся за парушэнне правілаў рыбалоўства і нават адбываў тэрмін. Падчас апошняга затрымання браканьер вылоўліваў шчупака восцямі. За 26 асобін рыбы яму давядзецца заплаціць каля 50 мільёнаў рублёў і зноў панесці крымінальнае пакаранне. Амаль 100 кілаграмаў рыбы вывалілі сеткамі трое браканьераў на вадасховішчы Бабруйкоўскім у Ельскім раёне. Ільвіную долю ўлову — 34 асобіны з 50 — складаў шчупак, які цяпер нерастуе. Дзяржінспектары Мазырскай міжрайінспекцыі канфіскавалі ў парушальнікаў 11 сетак даўжынёй больш за кіламетр. За незаконна здабытую рыбу кампенсаваць ім прыйдзецца каля 70 мільёнаў рублёў, — расказала **прэс-сакратар Дзяржінспекцыі Вольга ГРАМОВІЧ**.

Крымінальнае пакаранне чакае і сеткавіка з пасёлка Рось Ваўкавыскага раёна. У яго ўлове было 60 плотак і 6 шчупакоў. Кампенсацыя за аднаго незаконна вылаўленага шчупака падчас нерасту — 9 базавых велічынь! У выніку — мінус 24 мільёны рублёў з сямейнага бюджэту. Плюс буйны штраф. Дорага прыйдзецца заплаціць і затрыманаму на Дняпры магілёўцу за дзвюх сцерлядзяў і двух самоў, злоўленых багрэннем на яме. Сцерлядзь занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі, здабыча сома да канца сакавіка таксама была забаронена. Магілёўцу трэба будзе выплаціць каля 18 мільёнаў рублёў, а таксама буйны штраф.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

**Открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж»,**
расположенное по адресу:
г. Новолукомль, Витебская область, Лукомльское шоссе, 8, тел. 02133 60273

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

**Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются:** Открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж», г. Новолукомль, Витебская область, Лукомльское шоссе, 8.

**Цель приобретения акций, определенная общим собранием акционеров, на котором было принято решение о приобретении**: для аннулирования и последующего уменьшения уставного фонда в целях сокращения их общего количества.

**Категория приобретаемых акций**: простые (обыкновенные) акции.

**Количество приобретаемых акций**: 5 000 шт.

**Цена, по которой приобретаются акции:** 50 000 рублей за одну акцию.

**Срок, форма и порядок оплаты акций:** перечисление денежных средств на расчетный счет акционеров-владельцев акций – в свободные сроки, не ранее тридцати дней и не позднее шести месяцев с момента заключения договора.

**Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций:** г. Новолукомль, Витебская область, Лукомльское шоссе, 8.

**Даты начала и окончания срока представления предложений акционеров о продаже акций:** с 01 апреля 2016 г. по 30 апреля 2016 г.

**Даты начала и окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи акций)**: с 01 мая 2016 г. по 03 сентября 2016 г.

УНП 300007839

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов: добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1331963, 1331973, 1344010, 1360429, 1382045, 1402701, 1402726, 1414367, 1462662, 1462677, 1508863, 1523801, 1523830, 1089749, 1341746, 1341763, 1341768, 1341934, 1388981, 1415574, 1425950, 1425963, 1426568, 1426586, 1497205, 1497225, 1497226.

УНП 100782388

УНН 600038919

**ОАО «Світанак» г. Жодино**

**ПРИГЛАШАЕТ ОРГАНИЗАЦИИ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ**

**на выполнение технической диагностики и наладочных работ на газовом оборудовании набивной, сушильно-ширильных и сушильных машин (КИПиА систем топливоподачи, горелочных устройств) красильно-отделочного цеха ОАО «Світанак» г. Жодино.**

Заявки принимаются по адресу: **г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 10.00 18.04.2016 г.**
За дополнительной информацией обращаться по тел. 8(01775) 7-14-92, 7-97-74.

# ГЕНЕРАЛЬНАЯ ПРЫБОРКА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Сёлета горад мае патрэбу ў рамантаванні амаль 129 тысяч кв. м дарог. З пачатку месячніка па добраўпарадкаванні выканаы ямачны рамонт 8,6 тысячы кв. м асфальтабетоннага пакрыцця. Усяго падчас месячніка плануецца адрамантаваць больш за 11,8 тысячы кв. м вулічна-дарожнай сеткі. Таксама адрамантуюць тратуары, ад пяску і смецця ачысцяць больш за 22 млн кв. м дарог, расказаў **намеснік генеральнага дырэктара Гармаўтадара Мінгарвыканкама Анатоль ЖАМОЗДЗІК.**

У Мінску вядзецца работа па мыйцы, рамонце і афарбоўцы прыпынячных навесаў, лавак і ўрнаў. Акрамя таго, дарожнікі праводзяць вонкавы агляд сетак даждавой каналізацыі. Падчас месячніка ў сталіцы прывядуць у парадак чатыры падземныя пешаходныя пераходы, а таксама 20 мастоў і пуцеправодаў.

## Нашы дзеці, сабакі, машыны...

Вялікую занепакоенасць у спецыялістаў выклікае стан месцаў агульнага карыстання пасля зімы.

— Вы ўсе жыхары Мінска, бачыце, у штоператвараліся за зіму месцы пад вокнамі і балконамі. Гэта жахліва! Там стала менш смецця ў выглядзе пластыкавых бутэлек, але што датычыцца курэння — гэта недапушчальна. Самае страшнае, што з-за выкідвання недакуркаў з балконаў адбываюцца пажары, — звярнула ўвагу Галіна Гілевіч.

Паралельна з месячнікам па добраўпарадкаванні ў сталіцы аглядаюць інжынерныя сеткі, канструкцыйныя элементы дамоў, а таксама дзіцячых пляцовак.

— Візуальна дзіцячае абсталяванне трэба аглядаць штодня на прадмет вандальных дзеянняў і ўзроставага выкарыстання. Бяспека нашых дзяцей — справа не толькі работнікаў жыллёвых арганізацый, але і бацькоў, — нагадала Галіна Гілевіч.

Яна расказала, што планаў па ўстаноўцы новага дзіцячага абсталявання няма (можна толькі мяняць і рамантаваць старое). Але калі ў жыхароў узнікне жаданне набыць новыя прылады для дзіцячай пляцоўкі, яны могуць звярнуцца ў жыллёвую службу і за свае грошы закупіць абсталяванне.

У дварах сочаць не толькі за чысцінёй і станам малых формаў, але і за аўтамабілямі жыхароў. Выяўляюць неэксплуатаваныя аўто ці машыны ў дрэнным стане. Адметна, што аўтахламу на вуліцах Мінска з кожным годам становіцца менш. Летась у сталіцы выявілі 1075 безгаспадарных аўтамабіляў. З іх прывездена ў парадак больш за 570, утылізавана — звыш 330. Згодна з заканадаўствам, усе ўладальнікі кінутых аўто атрымліваюць паведамленне аб неабходнасці па працягу 30 дзён перамясціць транспартны сродак на ахоўную стаянку, прывесці ў належны стан альбо ўтылізаваць. Калі ўласнік не аб'явіўся, службы ЖКГ маюць права ў прымусовым парадку перавезці аўтахлам на ахоўную стаянку. Там кінуты аўтамабіль можа знаходзіцца да трох месяцаў, затым ён прызнаецца безгаспадарным і знішчаецца. Аплаціць выдаткі па яго эвакуацыі і захоўванні прыдзецца ўладальніку, прычым спагнаць плату з яго могуць у судовым парадку.

Апроч таго, у раёнах сталіцы праводзяцца акцыі па маніторынгу працэсу выгулу сабак. Іх гаспадароў знаёмяць з правіламі, нагадваюць, што за гадаванцам трэба прыбіраць. У выпадку парушэння правілаў на гаспадароў жывёл складаюць пратаколы: штраф можа дасягнуць пяці базавых велічынь. На сённяшні дзень у Мінску існуюць 49 пляцовак і 69 месцаў для выгулу сабак. Намеснік гендырэктара МГЖГ не адмаўляе: гэтага недастаткова, але за кошт будаўніцтва і ўшчыльнення горада колькасць такіх месцаў скарацілася.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

# ЛЯЦІМ ДА МОРА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На гэты конт Аляксей Стрэльчанка адзначыў, што ў ТОП-10 расстаноўка сіл мяняецца перш за ўсё за кошт краін традыцыйнага адпачынку — поўначы Афрыкі, рэйтынг якіх у вачах спажыўцоў апусціўся па прычыне тэрарыстычнай небяспекі. Праз гэта пацярпела і Турцыя, якая шмат гадоў была вызначальнай краінай для беларускага рынку. Але прадстаўнік «Цэнтркурорту» ўдакладняе, што беларускі рынак Турцыя не пакідае, і рэйсы туды заяўлены. Іншая справа, што нацыянальны авіяперавозчык, які ажыццяўляе ўсе чартарныя праграмы ў краіне, падышоў больш узважана да колькасці рэйсаў. Значна скарацілася і колькасць заказчыкаў на Турцыю. Спецыялісты «Белінтурыста» адзначаюць, што кансерватыўныя людзі старэйшага пакалення ад 50 гадоў, якія больш давяраюць друкаваным і тэлевізійным СМІ, сапраўды напалоханы падзеямі ў Турцыі і не плануюць там свой адпачынак, нават калі ў папярэднія гады праводзілі водпуск менавіта там. Што тычыцца моладзі, то з ёй не ўсё так адназначна. На першае месца яна ставіць грошы, а рызыка адыходзіць на другі план.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ШАНАВАЦЬ СВАЁ РОДНЕНЬКАЕ

Міхаіл Партной запэўніў, што Мінспорту будзе найперш падтрымліваць уязны і ўнутраны турызм. Менавіта гэты напрамак прыносіць краіне валюту.

Намеснік міністра лічыць, што на тэрыторыі нашай краіны хапае ўнікальных мясцін, якія заўсёды зацікавяць замежных турыстаў. У нашай кампактнай краіне з невялікім насельніцтвам ёсць чатыры аб'екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Для Беларусі гэта няблага. На ўсю Расію ўсяго толькі 27 падобных аб'ектаў.

Акрамя таго, у нашай краіне існуе 5,5 тысячы аб'ектаў, прызнаных культурнай спадчынай Беларусі. Ацэнку ўнутранаму турызму нашай дзяржавы даў кіраўнік Сусветнай турысцкай арганізацыі Талеб Рыфаі, калі летась наведваў Беларусь. Па выніках свайго падарожжа чыноўнік зрабіў аўтарытэтную заяву аб тым, што інфраструктура, якая ў нас ужо ёсць, дазваляе на гэтым сегменце зарабляць нармальныя грошы. Адзінае — трэба больш заяўляць аб сабе на сусветнай медыяпрасторы.

## ІСПАНІЯ ТАННЕЙШАЙ НЕ СТАНЕ

Чаканні нізкіх цэн па традыцыйных выязных напрамках не заўсёды апраўдаюцца, лічыць Аляксей Стрэльчанка.

Сёлета ў сувязі з неспакойнай сітуацыяй у Еўропе і ў свеце прафесіяналы чакалі памяншэнне турпатокаў і думалі, што хатэльеры (уласнікі гатэляў) знізяць цэны. Аднак па Іспаніі, якая і ў нас вельмі папулярная і куды ёсць не толькі авіяцыйныя рэйсы, але і аўтобусныя праграмы, цяпер назіраецца рост цэн на гатэлі. Чаму?

Таму што пасля турэцкага напрамку і Егіпта для расійскіх турыстаў найбольш прывабнай з'яўляецца менавіта Іспанія. Сюды пацяк расіян павялічыўся, а таму ўжо і няма падставы хатэльерам зніжаць кошты.

## ЗАМЕСТ КРЫМА — КРАСНАДАРСКІ КРАЙ

Аляксей Стрэльчанка паведамляе, што для іх кампаніі досыць новым і запатрабаваным кірункам сталі курорты Краснадарскага краю. Такога попыту на курорты Краснадара ў Беларусі раней не назіралася ніколі. І гэта не выпадковасць. Людзі шукаюць нейкую замену Крыму. У ранейшых маштабах ён выпаў з актыўных продажаў, таму што няма прамой перавозкі. Акрамя таго, у параўнанні з Крымам краснадарскія курорты павінны быць сапраўды таннымі. Аднак даступнасць гэтых курортаў цяпер пад вялікім пытаннем.

Справа ў тым, што тураператары Расіі актыўна пераарыентуюць унутраны рынак на ўласныя курорты. У выніку назіраецца каласальны рост наведвальнасці менавіта Краснадарскага краю. Напрыклад, узяць вядомы санаторый «Белая Русь» у Туапсэ. Калі летась у красавіку пуцёўкі на летні сезон былі ў продажы, то сёння прапанова там ужо адсутнічае. Таму чакаць тэндэнцыі зніжэння коштаў па гэтым кірунку бессэнсоўна. Кампаніі сур'ёзна разглядаюць курорты Краснадарскага края ў якасці папулярнага кірунку.

## РЭЗЕРВОВЫ ФОНД ПРЫ ФОРС-МАЖОРЫ

Пры падрыхтоўцы новага закона «Аб турызме» не адзін раз уздымалася тэма стварэння фонду дапамогі турыстам у экстранных сітуацыях. На гэты конт Міхаіл Партной паведаміў, што прапануецца ўвесці фінансавыя гарантыі і стварыць на базе грамадскага аб'яднання кампенсацыйны фонд.

Грошы будуць збірацца, напэўна, з кожнай пуцёўкі, дапусцім па 50 цэнтаў, а потым пералічвацца ў фонд. Гэта істотна не паўплывае на цану пуцёўкі. Пэўная частка сродкаў фонду дасць магчымасць кампенсаваць форс-мажорныя абставіны. Справа ў тым, што пры банкруцтве турфірмы пацярпелыя людзі могуць гадамі чакаць вяртання сваіх грошай. А са стварэннем фонду чалавек будзе гарантавана абаронены. Цяпер неабходна, каб такую прапанову падтрымалі дэпутаты.

## ЧАКАЕМ ВЯРТАННЯ РАСІЯН

Для большасці айчынных санаторыяў і дамоў адпачынку Расія з'яўляецца стратэгічным партнёрам. Міністэрства правяло вельмі актыўную маркетынгавую палітыку па асноўных багатых расійскіх рэгіёнах: Масква, Піцер, Новасібірск, Казань і інш. Напярэдадні новага сезона запланаваны сустрэчы ў Мінску з кіраўніком «Растурызму» Алегам Сафонавым. Ён прывозіць з сабой асноўных тураператараў, якія працуюць на выезд. Міхаіл Партной спадзяецца, што зніжэнне патоку расійскіх турыстаў будзе кампенсавана. «Я за тое, каб мы бралі аб'ёмамі, каб нашы санаторыі і гасцініцы былі запоўненыя, і мы на гэтым зараблялі. А не так, як на сённяшні дзень: і гасцініцы недастаткова запоўненыя, і санаторыі. Але пакуль існуе попыт на нашы прапановы, цана зменшацца не будзе. Хутчэй за ўсё, па пэўных параметрах і ў пэўных санаторыях, дзе добрыя продажы, яна можа сёлета нават павялічыцца», — удакладніў намеснік міністра.

> **«Сёння мы займаемся палёгкай або спрашчэннем візавых працэдур для бяспечных у міграцыйным плане краін разам з усімі зацікаўленымі органамі».**

У сваю чаргу, Аляксей Стрэльчанка паведамляе, што, паводле вынікаў першага квартала прадпрыемства «Цэнтркурорт», адзначаецца паляпшэнне сітуацыі ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. Вяртанне расіян на свой унутраны рынак закранула нас са старонкі боку. Цяпер назіраецца рост цікавасці да нашай краіны, павелічэнне попыту — і па санаторыях, і па экскурсійных праграмах.

## БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

Не сакрэт, што адной з важных прычын, якія стрымліваюць уязны турызм у Беларусь, з'яўляюцца візавыя абмежаванні (высокі кошт, складаная працэдура атрымання, немагчымасць аформіць для турыстаў шматразовыя візы праз турыстычныя кампаніі). Нядаўна Мінспорту і турызму чарговы раз выступіла з прапановай спрасціць візавы рэжым для грамадзян спрыяльных у міграцыйным плане дзяржаў. Раней абмяркоўвалася магчымасць дазволіць турыстам уезд без візы на тры дні, прапаноўвалася таксама зрабіць візы бясплатнымі для гасцей турыстычных мерапрыемстваў. Ці магчыма ў гэтым напрамку чакаць прарыву ўжо сёлета?

Міхаіл Партной лічыць, што гэту тэму неабходна развіваць, аднак усё рухаецца не так хутка, як хацелася б. «Мы ўвялі бязвізавы рэжым з Турцыяй, потым з Ізраілем, спрасцілі візавы рэжым з Кітаем, адмянілі візу для наведвання Белавежскай пушчы тэрмінам да трох дзён. Як толькі гэта здарылася, колькасць наведвальнікаў у Белавежскай пушчы павялічылася ў паўтара раза. Сёння мы займаемся палёгкай або спрашчэннем візавых працэдур для бяспечных у міграцыйным плане краін разам з усімі зацікаўленымі органамі — міністэрствамі замежных спраў, эканомікі, фінансаў. У мяне ёсць вялікая надзея, што ў найбліжэйшы час такое рашэнне будзе прынята. Еўрапейцы адвыклі ад віз, і для іх праблема праходзіць гэтую нашу адміністрацыйную працэдуру».

## АДЗІНЫ ТУРЫСТЫЧНЫ ПАРТАЛ — УЖО СЁЛЕТА

Спадар Партной упэўнены, што такі турыстычны партал краіне неабходны, але гэтая праца не хуткая. Напрыклад, Грузія два гады займалася прасоўваннем сваёй праграмы і ўклала на рэалізацыю даволі вялікія сродкі. Наша краіна тут рухаецца па некалькіх напрамках. Нацыянальнае агенцтва па турызме нарошчвае інфармацыйны складнік. А што тычыцца продажу прадукту ў рэжыме анлайн, гэтым займаюцца туркампаніі, у тым ліку «Цэнтркурорт». Нацыянальны турыстычны рэсурс адзінага інтэрнэт-партала будзе мець назву Ветліва.by. Па яго стварэнні ўжо праведзена пэўная праца, «Цэнтркурорт» мае досвед у гэтым кірунку яшчэ з чэмпіянату свету па хакеі. Да канца года міністэрства плануе запусціць гэты прадукт.

## ЗНІЖКІ НІХТО НЕ АДМЕНІЦЬ

Апошнім часам ішлі размовы пра тое, што туркампаніі могуць увогуле адмовіцца ад сезонных зніжак. На гэты конт Міхаіл Партной паведаміў, што сапраўды некаторыя беларускія турфірмы абвясцілі, што з 11 сакавіка больш не будуць даваць неабгрунтаваных зніжак турыстам, але гэтага не адбылося таму, што рынак дыктуе свае ўмовы — ёсць попыт і ёсць прапанова, ёсць рыначныя адносіны. Але таксама ёсць і пэўныя рэчы, якія прыводзяць, напрыклад, да такіх падзей, як з «Аўрора Тур», якая складала дагаворы і дзейнічала па шэрых схемах. Да такіх зніжак трэба падыходзіць вельмі асцярожна, таму што людзі могуць пацярпець. Што тычыцца ранняга браніравання і гарачых тураў, то яны існавалі і будуць існаваць.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*


ФРАНСАБАНК FRANSABANK

«Франсабанк» Открытое акционерное общество
Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 95А
тел.: (017) 389 36 36, факс: (017) 389 36 37
office@fransabank.by www.fransabank.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2016 | 01.04.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 117 784 | 80 205 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 11 | 84 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 8 018 | 203 430 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 62 658 | 49 766 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 328 727 | 62 327 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 554 216 | 563 473 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 1 | 1 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 187 411 | 181 271 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 10 561 | 3 558 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 1 269 387 | 1 144 115 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | 32 064 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 487 294 | 450 390 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 403 752 | 314 337 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 191 | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 5 983 | 18 167 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 897 220 | 814 958 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 113 704 | 113 704 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 11 105 | 7 899 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 133 791 | 128 814 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 113 567 | 78 740 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 372 167 | 329 157 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 1 269 387 | 1 144 115 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2016 | 01.04.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 32 719 | 29 876 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 12 643 | 16 834 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 20 076 | 13 042 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 4 739 | 8 567 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 673 | 509 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 4 066 | 8 058 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 1 | 2 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (26) | 31 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 12 146 | 11 868 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 2 311 | 5 300 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 121 | 301 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 19 385 | 17 637 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 820 | 959 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 14 868 | 9 406 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 995 | 2 262 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 12 873 | 7 144 |

Председатель Правления А.В. Игнатов

Главный бухгалтер Л.Б. Паденова

Дата подписания «01» апреля 2016 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 15 от 26.04.2013 г.
УНП 100755021.


## Тым часам

## НА МАЙСКІЯ СВЯТЫ — У БЕЛАРУСЬ

**Наша дзяржава ўзначальвае рэйтынг краін, папулярных для падарожжаў расійскіх турыстаў на майскія святы. Аб гэтым паведамляе турыстычны анлайн-сэрвіс Travel.ru.**

Акрамя Беларусі, у ТОП-10 замежных краін у расійскіх турыстаў таксама ўваходзяць Чэхія, Італія, Іспанія, Тайланд, Грэцыя, Латвія, Эстонія, Літва і Германія. У першую дзясятку папулярных замежных гарадоў для паездак на найбліжэйшыя працяглыя святы ўваходзяць Мінск, Прага, Рым, Рыга, Барселона, Вільнюс, Талін, Хельсінкі, Баку і Браціслава. У Мінск расійскія турысты галоўным чынам бранiруюць паездкі на тры дні і выдаткоўць на пражыванне ў сярэднім 3 тысячы расійскіх рублёў за суткі, а за мяжой — амаль 6,4 тысячы расійскіх рублёў.

Танней за ўсё паехаць на майскія за мяжу можна ў беларускі Брэст, дзе за пражыванне турысты заплацяць менш за 2 тысячы расійскіх рублёў у суткі.

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
7 КРАСАВІКА 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 6 (15790)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Lesley Knife: «Вініл — гэта нешта сакральнае»

**Легенда айчыннай heavy-metal сцэны, сапраўдныя ветэраны року Gods Tower і сёння знаходзяцца ў выдатнай творчай форме. Не так даўно гурт прадставіў новую песню Liar і аднайменны кліп, а таксама адыграў выдатны канцэрт у сталічным клубе Re: public. Пра захапленне вінілам, пераемнасць у музыцы, «залатыя часы» гурта і стаўленне да прыхільнікаў мы сёння гутарым з лідарам Gods Tower Уладзіславам Наважылавым, які выступае пад сцэнічным псеўданімам Lesley Knife.**



***— У чым сакрэт выдатнай творчай формы гурта — пастаянныя рэпетыцыі, шмат сумеснай працы?***

— Проста мы больш нічога не ўмеем. У іншых сферах жыцця асабіста я вялікіх поспехаў не дасягнуў. Больш за ўсё люблю сцэну і найлепш сябе адчуваю менавіта на ёй. Музыка — гэта тое, што ў мяне найлепш атрымліваецца ў жыцці. Там я на ўсе сто працэнтаў выкладваюся і менавіта там атрымліваю зваротную рэакцыю. Усё астатняе — эпізоды.

***— Апошнім часам у вас выйшла некалькі альбомаў на вінілавых пласцінках. Чым патлумачыце такое захапленне?***

— Калі маеш вініл — маеш рэч! Гэта якасны гук. Гэта легендарна. Гэта рэч, якая зрабіла рок-н-рол і heavy-metal і асацыіруецца з імі наўпрост. Заняпад музыкі пачаўся менавіта тады, калі з'явіліся кампакт-дыскі, пачалі развівацца лічбавыя тэхналогіі. Бо запісваць дыск дома стала звычайнай з'явай. А вось вініл дома ніяк не зробіш. Гэта рэч, каштоўная сама па сабе, нават сакральная. Я лічу, што сёння наогул няма сэнсу выдаваць кампакт-дыскі. Таму мы і сканцэнтраваліся менавіта на вытворчасці вінілаў.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Складанасці пошуку

# ЗНАЙСЦІ ПРАЦУ МАРЫ

## МОЖНА І НА «ДНІ КАР'ЕРЫ», І Ў ІНТЭРНЭЦЕ

**Хто стаў першым у гісторыі доларавым мільярдэрам? Для чаго прадзюсар Элвіса Прэслі прадаваў футболкі з надпісам «I hat Elvis» («Я ненавіджу Элвіса»)? Сабекошт якога вырабу ў СССР у 8 разоў перавышаў яго рынычны кошт? З якой мэтай выдаўцы геаграфічных картаў змяшчалі на сваю прадукцыю выдуманыя гарады?**
**Даць адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні, якія тычыліся бізнесу, працы і кар'еры, прапаноўвалася ўдзельнікам інтэлектуальнага марафону. Спаборніцтвы, да якіх далучыліся 20 студэнцкіх каманд, упершыню прайшлі ў рамках «Дня кар'еры» ў БДУ. А пытанні для моладзі падрыхтавалі кампаніі-працадаўцы.**

### ДЫПЛОМ — ЯШЧЭ НЕ ПРОПУСК

— Дні кар'еры праводзяцца ў нас традыцыйна восенню і вясной. Але калі асенняе мерапрыемства нацэлена ў большай ступені на пошук студэнтамі месца для праходжання стажыровак і вытворчай практыкі, то вясенняе ставіць на мэце яшчэ і працаўладкаванне выпускнікоў, — уводзіць у курс справы **начальнік упраўлення кадраў БДУ Наталля НЯПЕЎНАЯ.** — «Дзень кар'еры» карыстаецца ўсё большай папулярнасцю. Арганізацыі і прадпрыемствы не ўпускаюць магчымасці заявіць пра сябе, а студэнты — пагутарыць з патэнцыяльнымі працадаўцамі. Ёсць інтарэс да «Дня кар'еры» і з боку студэнтаў іншых ВНУ. Некаторым кампаніям нават даводзіцца адмаўляць з-за дэфіцыту месца. У перспектыве ў нас ёсць намер разгарнуцца яшчэ больш маштабна, таму задумваемся пра новыя пляцоўкі...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

Вау!

# САМЫ ВЕТЛІВЫ БАКСЁР НА РЫНГУ,

## ці Што захапляе дзяўчат у гэтым відзе спорту

**Кацярына КАРАНЕЦ вучыцца на IV курсе БДУІР на спецыяльнасці «Штучны інтэлект», але сярод знаёмых больш вядомая як... дзяўчына-баксёр. Яна цалкам разбурае стэрэатып пра мужчынападобнасць прадстаўніц прыгожага полу, якія займаюцца гэтым відам спорту. Кацярына стала фіналісткай адкрытага Кубка Беларусі па боксе — 2015 і чэмпіянату Рэспублікі Беларусь — 2015. Аб тым, як у яе атрымліваецца заставацца дзяўчынай у «нежаночым» спорце, яна расказала нашаму карэспандэнту.**



Фота Кацярыны ВАРВАШЭНІ.

Бокс як рукой здымае ўвесь негатыў.

— Палова людзей, калі даведваюцца, што я займаюся боксам, рэагуюць прыкладна так: «Навошта табе гэта?» і «Які жах!» А іншыя, наадварот, кажуць: «Ваў, дзяўчына-баксёр!» Некаторыя пачынаюць жартаваць, маўляў, я іх зараз паб'ю, — кажа Кацярына. — Насамрэч, калі пачынала займацца і яшчэ не было сапраўдных баёў, многія мяне падтрымлівалі. Але як толькі пачала прыходзіць дадому з раздзёртымі костачкамі ці злёгку пабітая, зразумела, сям'я выступіла супраць. Калі сказала, што паеду на свой першы чэмпіянат, усе захваляваліся. Самым цяжкім было ісці да ўрача на медагляд перад спаборніцтвам. Ён проста сказаў «не». У мене не было ніякіх супрацьпаказанняў, але ўрач быў упэўнены, што бой — гэта не для дзяўчат. Потым я ўсё роўна прайшла медкамісію і дамовілася, каб мне выдалі даведку.

У бокс Кацярына патрапіла выпадкова, а на сёння ў гэтым відзе спорту — ужо трэці год. Неяк аднагрупніца прапанавала пайсці ў трэнажорку, а ў суседняй зале вёў заняткі трэнер па боксе. І вось аднойчы ён кажа: «Не жадаеце паспрабаваць?» А яна заўсёды хацела. Раз ёсць шанц, натуральна, згадзілася. А далей пачаліся трэніроўкі. Кацярына расказвае, што першы час яны вельмі доўга вучыліся размінацца, бо ў боксе гэта ці не галоўнае. Потым адпрацоўвалі элементы перад люстэркам і ў выніку былі дапушчаны да сапраўдных баёў.

— Мы павінны быць падобныя на лягушку, якая скача. У нас кажуць: добрага баксёра ногі кормяць. Але, калі выконваем удары перад люстэркам, трэнер жартуе: што вы, як фотамадэлі, паварочваецеся?! Трэніруемся са снарадамі і адпрацоўваем навыкі ў парах, але адзін з адным б'ёмся няшмат. Трэнер, магчыма, шкадуе нас. Практыкуем вольны бой толькі ўжо бліжэй да спаборніцтваў, каб праверыць сябе на трываласць у рэальных умовах, — працягвае Кацярына.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Каштоўная парада*

# ЯКУЮ ПРАФЕСІЮ ВЫБРАЦЬ?

## Студэнты дапамагаюць школьнікам вызначыцца

**Напрыканцы апошняга навучальнага года хтосьці мітусіцца ў пошуку выпускнога строю, нехта трасецца ў перадэкзаменацыйнай ліхаманцы. А некаторыя задуменна разважаюць над філасофскім пытаннем «Кім стаць?» Вядома, адказ на яго павінен быць задоўга да часу «Х», але над тым, які факультэт выбраць, як не праліцца з навучальнай установай, можна працягваць разважаць да апошняга. Вольга ПАДАМАЦЬКА, ідэйны лідар праекта «Прафарыентацыя — твой упэўнены крок у будучыню», прапанавала прынцыпова новы падыход да высвятлення дзелавых якасцяў у школьнікаў.**


Пасля аднаго з трэнінгаў.

— Калі я паступала ў БДУ, спачатку мне было цяжка вызначыцца са спецыяльнасцю — менеджара-эканаміста. Адольвалі думкі, ці змагу працаваць у гэтай сферы, а што, калі ў мяне нічога не атрымаецца і г.д. Неяк на другім курсе мы з сяброўкамі завялі размову на гэтую тэму і высветлілася, што яны таксама сутыкнуліся з аналагічнай праблемай. Так я загарэлася жаданнем стаць дарадчыкам школьнікам, якія апынуліся на прафесійным раздарожжы. Разам з камандай аднадумцаў распрацавалі трохдзённы трэнінг, — расказвае Вольга.

***— Раскажыце пра яго больш падрабязна.***

— Пачынаем мерапрыемства з псіхалагічных тэстаў, ролевых гульняў. Тут мы абапіраемся на распрацоўкі Міністэрства адукацыі, выкарыстоўваем класічныя схемы выяўлення прафесійных схільнасцяў школьніка. Псіхолагі расказваюць, як справіцца з хваляваннем падчас экзаменаў і цэнтралізаванага тэсціравання. Другі дзень трэнінгу адводзіцца на практыкум ад шасці экспертаў. Ёсць пералік пытанняў, якія трэба асвятліць. Напрыклад, падача дакументаў ва ўніверсітэт. Хтосьці са студэнцкіх лідараў (старшакурснікаў) павінен знайсці дадатковую інфармацыю па кожнай ВНУ і коратка занатаваць яе ў спецыяльную метадычку.

> **На заметку**
>
> **Трэнінгі для ўдзельнікаў — бясплатныя, усе выдаткі бяруць на сябе арганізатары. У сацыяльнай сетцы «УКантакце» ёсць група праекта «Прафарыентацыя». Праз яе можна запоўніць заявачную форму для ўдзелу ў трэнінгу. Пасля гэтага з ахвотнымі звяжуцца — анлайн або па тэлефоне. Наступны трэнінг запланаваны на 17 красавіка.**

Далей трэба правесці прэзентацыю і адказаць на пытанні слухачоў. Па тым жа прынцыпе школьнікі даведваюцца пра тое, як праходзіць размеркаванне ў студэнтаў бюджэтнай формы навучання, што такое ваенная кафедра, якія абавязкі накладвае пражыванне ў інтэрнаце, чым адрозніваюцца дзейныя ўніверсітэты і якія пры іх дзейнічаюць студэнцкія арганізацыі, як можна танна падарожнічаць падчас студэнцтва. На трэці дзень мы запрашаем студэнцкіх лідараў з розных ВНУ і факультэтаў, якія расказваюць пра сваю вучобу, асвятляюць пэўныя нюансы той ці іншай прафесіі, адказваюць на пытанні ўдзельнікаў.

***— Ці залучаеце староннiх спецыялістаў на свае прафарыентацыйныя мерапрыемствы?***

— Звычайна бывае так: школьнік у рэгістрацыйным бланку піша, напрыклад, што не можа выбраць паміж лагістыкай і бухгалтарскім улікам. Тады мы хуценька шукаем будучых спецыялістаў у гэтай сферы і арганізуем ім сустрэчу ў рамках мерапрыемства. Неяк у нашай групе «УКантакце» адна дзяўчына напісала: «хачу дазнацца пра фрыланс». Мы тут жа правялі апытанне, хто яшчэ цікавіцца гэтым. Так у нас у гасцях апынуўся фрылансар.

З кожным госцем мы папярэдне праводзім кароткае сумоўе, каб пераканацца, што чалавек можа кампетэнтна падысці да даручанай яму працы, акцэнтаваць увагу на сутнасці прафесіі.

***— Вы гаворыце пра новыя падыходы ў навучанні. Што маецца на ўвазе?***

— Імкнёмся быць на адной хвалі з нашымі выхаванцамі. Тут няма доўгіх, марудных лекцый, напружанасці, боязі быць абсмяяным за нетактоўнае пытанне. Арганізоўваем для ўдзельнікаў кава-паўзы, дазваляем свабодна перамяшчацца па аўдыторыі падчас заняткаў. А яшчэ кожную гадзіну праводзім міні-зарадку.

***— Ці ёсць нейкія абмежаванні для ўдзельнікаў трэнінгаў?***

— Мы выступаем супраць таго, каб на іх прысутнічалі дарослыя. Самі школьнікі часта скардзяцца на тое, што бацькі навязваюць ім тую ці іншую прафесію. Наша задача, наадварот, даць магчымасць дзіцяці самастойна прыняць рашэнне. Звычайна да нас прыходзяць старшакласнікі, але мы не ставім узроставых абмежаванняў.

***— Што ў вашых далейшых планах?***

— Плануем наведваць профільныя класы, дзе большая частка вучняў ужо ведае, у якім кірунку рухацца. Будзем браць з сабой аднаго псіхолага і траіх-пяцярых студэнтаў. Ёсць ідэя ўвесці анлайн-кансультацыі. Дакладней, будзем публікаваць адказы на пэўныя пытанні ў групе «УКантакце». А яшчэ хацелася б праводзіць падобныя мерапрыемствы і ў рэгіёнах. Бо прыехаць у сталіцу праблематычна і ў грашовым, і ў часавым плане.

**Алена ЯКАВЕНКА,**
**студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

# ЗНАЙСЦІ ПРАЦУ МАРЫ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— На Захадзе і нават у суседняй Расіі, дзе першае працоўнае месца з'яўляецца клопатам саміх выпускнікоў, такія мерапрыемствы арганізуецца кіраўніцтвам ВНУ, каб дапамагчы студэнтам у іх пошуках, — канстатуе **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей АБЛАМЕЙКА.** — Тым больш што нават дыплом прэстыжнай ВНУ не заўсёды адчыняе жаданыя дзверы.

## АБАВЯЗАК ЦІ ЛЬГОТА?

У БДУ ў папярэднія гады размяркоўваліся 98—99% выпускнікоў бюджэтнай формы навучання, а вось сёлета сітуацыя з прадастаўленнем выпускнікам першага працоўнага месца складваецца больш напружаная. Праз эканамічныя цяжкасці многія прадпрыемствы не імкнуцца браць на работу маладых спецыялістаў, на якіх распаўсюджваецца цэлы шэраг сацыяльных гарантый, у тым ліку і абарона ад скарачэння. І калі раней студэнты-«бюджэтнікі» стараліся пазбегнуць размеркавання, то цяпер ужо нават многія «платнікі» просяць знайсці ім першае працоўнае месца. Летась у БДУ, напрыклад, былі размеркаваныя па ўласным жаданні 6% выпускнікоў, якія навучаліся на ўмовах аплаты. Такім чынам цяжкі абавязак раптоўна пераўтварыўся ў сацыяльную льготу.

— Сёння мы працуем з працадаўцамі кропкава. Адправілі ім каля тысячы лістоў. І прыкладна 77% ранейшых заявак ужо пацверджаны, — абнадзейвае Наталля Няпеўная. — Хачу заўважыць, што наша задача — не проста забяспечыць першае рабочае месца, а каб малады спецыяліст трапіў менавіта ў тую кампанію, дзе яму будзе цікава і дзе ён зможа максімальна сябе рэалізаваць. Таму калі выпускнік загадзя знайшоў сабе месца працы і прынёс персанальную заяўку ў камісію па размеркаванні, пастараемся пайсці яму насустрач, нават калі гэта будзе і недзяржаўная кампанія. Галоўнае — сумяшчаць інтарэсы выпускнікоў і працадаўцаў.

## МІНІ-КАДРАВАЕ АГЕНЦТВА

Пра яшчэ адзін спосаб рэкламавання выхаванцаў БДУ — электронную базу рэзюме — расказаў **дацэнт факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, кандыдат фізіка-матэматычных навук Мікалай КАЛЬЧЭЎСКІ:**

— Мы распрацавалі электронны рэсурс, дзе прадстаўлены выпускнікі гэтага года трох факультэтаў — фізічнага, механіка-матэматычнага і факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій. Усе анкеты змяшчаюць апісанне навуковай дзейнасці, узровень валодання замежнымі мовамі, камп'ютарнымі і прафесійнымі навыкамі, а таксама дадатковую інфармацыю пра захапленні, хобі і кантактныя звесткі. Мы пераканаліся, што даволі часта ў наймальнікаў няма магчымасці прыязджаць ва ўніверсітэт, праводзіць са студэнтамі выпускных курсаў гутаркі, да таго ж яны спасылаюцца на нізкую эфектыўнасць такой дзейнасці. А навігацыя сэрвісу дазваляе хутка азнаёміцца са звесткамі прэтэндэнтаў, а таксама падабраць кандыдата з улікам патрабаванняў наймальніка. У сістэме запаўняецца вельмі простая форма: назва кампаніі, зручны для гутаркі час і тая інфармацыя, якую працадаўца палічыць неабходным давесці да ведама. Паведамленне пойдзе па двух каналах: на электронную пошту (але яе мы правяраем нерэгулярна) і з дапамогай SMS. Убачыўшы апошнюю на сваім смартфоне, студэнт тэарэтычна ўжо праз гадзіну можа атрымаць працу сваёй мары.

А з 1 верасня гэта база будзе працаваць ужо для ўсіх факультэтаў. Размясціць свае анкеты ў ёй змогуць як студэнты-«бюджэтнікі», так і студэнты-«платнікі». У наймальнікаў будзе магчымасць пагледзець адразу ўсіх студэнтаў БДУ і скласці ўражанне аб спецыялістах, якіх мы рыхтуем. Наступны год, заўважу, будзе яшчэ больш складаны ў плане працаўладкавання выпускнікоў, таму што чакаецца падвоены выпуск маладых спецыялістаў (тых, што навучаліся па чатырохгадовай і пяцігадовай праграме вышэйшай школы). І самае галоўнае пытанне — ці паглыне рынак працы такую колькасць выпускнікоў?

## А, МОЖА, У ПАГРАНІЧНІКІ?

Сярод удзельнікаў «Дня кар'еры» былі прадстаўлены ІТ-кампаніі, транспартна-лагістычныя, аўдытарскія, кансалтынгавыя і юрыдычныя кампаніі. Запрашалі да супрацоўніцтва студэнтаў і два банкі, а таксама Дзяржпагранкамітэт. Апошні быў навічком на гэтым мерапрыемстве, але менавіта ён быў зацікаўлены ў прыцягненні спецыялістаў самага рознага профілю.

— Нас цікавяць юрысты, фінансісты, біёлагі, фізікі, спецыялісты ў ІТ-галіне, гісторыкі — адным словам, выпускнікі практычна з любога факультэта, — тлумачыць маёр медыцынскай службы Антон Гаўрылаў. — Усе вакансіі ў рэжыме рэальнага часу можна даведацца на сайце Дзяржпагранкамітэта. Для выпускнікоў праца ёсць не толькі на мяжы, нашы часці знаходзяцца і ў буйных гарадах. Можна працаваць у прапускных пунктах, напрыклад у аэрапорце.

Маладым спецыялістам абяцаюць заробак ад 6 млн рублёў, але кандыдат у пагранічнікі павінен быць здаровым, дысцыплінаваным і добрапрыстойным грамадзянінам, бо пры працаўладкаванні абавязкова правераць біяграфію прэтэндэнта.

Кампанія міжнародных аўтамабільных грузаперавозак «Джэнці» прапаноўвала вакансіі спецыяліста па продажу транспартных паслуг і спецыяліста па арганізацыі міжнародных грузаперавозак. Сярод патрабаванняў да кандыдатаў — веданне замежных моў, актыўная жыццёвая пазіцыя, камунікабельнасць і адказнасць.

«Рэкруцёры» з кампаніі Qulix Systems шукалі распрацоўшчыкаў праграмнага прадукту, тэсціроўшчыкаў і бізнес-аналітыкаў. Маладыя людзі запаўнялі анкеты і раствараліся ў натоўпе...

Спрабаваў зацікавіць выпускнікоў новымі магістарскімі праграмамі і сам Белдзяржуніверсітэт. Напрыклад, сумесная з Універсітэтам прыкладных навук (Германія) праграма «Кіраванне ў рэальным сектары эканомікі» з магчымасцю атрымання і беларускага, і нямецкага дыплома. «Фішка» гэтай праграмы — магчымасць індывідуальна фарміраваць траекторыю свайго навучання, якая складаецца з эканамічнага, тэхнічнага і прыродазнаўча-навуковага модуляў. Можна выбраць, для прыкладу, ІТ-галіну ці біятэхналогіі. Фактычна тут будуць рыхтаваць спецыялістаў, якія валодаюць і інжынернымі ведамі, і кіраўніцкімі метадамі, з крэатыўным мысленнем і выдатным валоданнем дзелавой англійскай мовай. Навучанне ў магістратуры, дарэчы, будзе праходзіць толькі на англійскай мове.

## ПАРАДАК... У САЦЫЯЛЬНЫХ СЕТКАХ

Спецыяльна для студэнтаў быў арганізаваны і майстар-клас, дзе іх вучылі, як граматна скласці рэзюмэ, каб цябе заўважылі на кадравым рынку.

Вось толькі адзін нюанс. Што можна запісаць у графу «Вопыт працы», калі працоўнага досведу пакуль няма? Карыснай для наймальніка інфармацыяй можа аказацца, напрыклад, тэма дыплома, курсавой ці навуковай працы студэнта, калі яна, канешне, адпавядае вакансіі. Досвед фрылансу або ўдзел студэнта ў цікавых праектах...


Фота Надзеі БУЖАН.

Не сакрэт, што працадаўцы актыўна маніторацць звесткі пра прэтэндэнта ў сацыяльных сетках. Таму трэба абавязкова прывесці ў парадак сваю старонку, пераглядзець фота, перачытаць свае статусы і лішняе выдаліць ці ўстанавіць на старонцы настройкі прыватнасці...

Студэнтаў цікавіла, ці варта размяшчаць у рэзюмэ фота: на Захадзе ад гэтай практыкі ўжо адмаўляюцца, бо знешнасць чалавека можа падсвядома ўплываць на выбар «рэкруцёра». Аднак, як высветлілася, у нас усе звяртаюць увагу менавіта на фота і рэзюмэ без фатаграфіі мае менш шанцаў быць заўважаным. Ну, безумоўна, калі кандыдат не прывядзе салідны пералік дасягненняў, міма якіх прайсці будзе проста немагчыма.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**P.S.** ***Адказы да пытанняў інтэлектуальнага марафону***

***Першым доларавым мільярдэрам стаў Джон Ракфелер — заснавальнік кампаніі Standard Oil.***

***Прадзюсар Элвіса Прэслі прымяняў шмат нестандартных падыходаў. Напрыклад, ён выпускаў футболкі і значкі з надпісам «I hate Elvis» ( «Я ненавіджу Элвіса»), каб атрымліваць грошы з тых, хто ніколі б не купіў пласцінкі спевака.***

***Сабекошт адной савецкай капейкі ў 8 разоў перавышаў яе рыначны кошт. А выдуманыя гарады выкарыстоўваліся стваральнікамі картаў для абароны ўласнай прадукцыі ад плагіяту.***

З пошты Чырвонкі ЧЗ

## МОЎЧКІ ЗАСТЫЛІ АБЕЛІСКІ

**Ганна КУРТАСАВА, вучаніца 11 класа ліцэя №2 г. Мінска:**

**«Мінулае... Вы калі-небудзь задумваліся аб тым, як апынуцца ў ім і змяніць яго? Што было б, калі б з'явілася такая магчымасць? Мне хацелася б спыніць войны.**

Я ведаю, што кожны з нас зноў хацеў бы пабачыцца з тым, каго страціў, пачуць яго голас, зазірнуць у вочы, дакрануцца да рукі, зноў абняць дарагога і блізкага чалавека. Разумеючы, што гэта немагчыма, мы дастаём стары фотаальбом, павольна перагортваем старонкі, углядаемся ў здымкі, у твары блізкіх людзей — і пачынаем плакаць...

Думаючы аб тым часе, калі была Вялікая Айчынная вайна, я кожны раз прыгадваю ветэранаў, якія засталіся ў жывых і перамаглі ворага. Яны рады за нас, за мірную краіну, за тое, што ўсё ідзе сваім парадкам. Яны ўсміхаюцца. Але калі ўважліва паглядзець у іх вочы, то можна заўважыць там сум і смутак. Іх душы плачуць аб тым, што няма побач таварышаў і блізкіх, якія загінулі ад куль ворагаў. Ім балюча за тое, што астатнія не могуць разам з імі ўбачыць, як змяніўся свет, людзі, сама Радзіма.

Хочацца нізка апусціцца на калені перад магіламі загінулых і выказаць словы падзякі за тое, што цяпер мы можам любавацца прыгажосцю прыроды, спакойна жыць у любові і згодзе, гадаваць сваіх дзяцей і расказваць ім пра геразім нашых вызвалеўнікаў!»

## МОЦНЫЯ ХАРАКТАРАМ

**Крысціна ЛЫЧКОЎСКАЯ, студэнтка І курса Інстытута журналістыкі БДУ:**

**«Штогод больш за сто маладых людзей здаюць уступныя экзамены ў Акадэміі і Магілёўскім інстытуце МУС. З юнакамі ўсё зразумела. На тое яны і мужчыны, каб быць на абароне міру і справядлівасці.**

А што кіруе дзяўчатамі, якія замест вясёлых вечарынак выбіраюць казарму, пляц і страявую? Якімі якасцямі трэба валодаць, каб дабіцца пастаўленай мэты? Яны павінны быць моцныя характарам, настойлівыя, каб вытрымаць не толькі інтэлектуальныя выпрабаванні, але і фізічныя. Галоўная мэта — прайсці курс маладога байца і атрымаць магчымасць стаць прадстаўніком Закона.

— Гэта нялёгка псіхалагічна. Па-першае, ты павінен ужо ў жніўні быць на вучобе, гэта значыць, лета для цябе заканчваецца на месяц раней, чым для ўсіх тваіх учарашніх аднакласнікаў. Па-другое, ты знаходзішся далёка ад дома, ад блізкіх і сяброў. Па першым часе вельмі нязвыкла, — прыгадвае курсант першага курса факультэта міліцыі Магілёўскага інстытута МУС Юлія Гулак. — Але які салодкі той момант, калі ты перадольваеш гэта ўсё і разумееш, што вытрымала, што змагла! Вера ў сябе, свае сілы і магчымасці павялічваецца неймаверна!»

## А ДАВАЙЦЕ БЕЗ ЯРЛЫКОЎ!

**Ганна ЗЯНЕВІЧ, студэнтка І курса факультэта маркетынгу БДЭУ:**

**«У паштовых аддзяленнях Мінска мянялі праграмнае забеспячэнне. Менавіта гэта і стала прычынай таго, што абслугоўванне вялося не так хутка, як звычайна.**

У адным з аддзяленняў працавалі ўсе чатыры аперацыйныя акенцы, каля кожнага была значная чарга. У натоўпе стаяла маладая жанчына з малым дзіцем, і неабыякавыя людзі вырашылі яе прапусціць наперад. У гэты момант больш сталая наведвальніца распачала канфлікт. «Сядзіць увесь дзень дома з дзіцем, не можа прыйсці на пошту ў іншы час! Я ўвесь дзень адпрацавала, а яна, бач ты, лезе без чаргі!» Маладая жанчына з годнасцю выйшла з канфлікту, адказваючы на абразы ўпэўнена, без грубасці і пагарды. Але ж, напэўна, кожны ведае, як балюча могуць раніць такія словы. Але на гэтым усё не скончылася. Нас абслугоўвала пажылая работніца. Адпраўка лістоў зацягнулася і ў чарзе пачуліся рэплікі кшталту «старая, не ўмее нічога рабіць», «няхай ужо на пенсію ідзе»...

Я лічу, што трэба заўсёды паважаць чалавека і яго працу. Чаму мы звяртаем увагу толькі на еўрапейскія зарплаты і ўмовы жыцця, і абсалютна не заўважаем адсутнасці ў іх грамадстве шырока распаўсюджаных у нас абразлівых стэрэатыпных поглядаў: «калі стары — бяры швабру», «малады — дурны», «хворы — калека»? Куды, скажыце, часам знікаюць нашы годнасць і дабрыня?..»

Лісты чытаў Сяргей РАСОЛЬКА.
*rs@zviazda.by*

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

## Іерогліфы для навучэнцаў трэцяга ўзросту

**Студэнт ІІ курса факультэта міжнародных адносін БДУ Мікіта Петручэня ў рамках праграмы ўніверсітэта трэцяга ўзросту арганізаваў на валанцёрскіх пачатках заняткі для пенсіянераў, які жадаюць вывучаць кітайскую мову. Яны карыстаюцца вялікай папулярнасцю.**

— Заняткі ідуць ужо цягам двух месяцаў, іх наведваюць 16 чалавек ва ўзросце за 60 гадоў. Мне дапамагае студэнтка-кітаянка, якая вучыцца ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, — расказаў у гутарцы з намі Мікіта. — Палова часу ідзе ўласна на вывучэнне кітайскай мовы (нашым выхаванцам падабаецца паступова запамінаць іерогліфы), а частка — на вывучэнне самой краіны, культуры, быту і сямейных каштоўнасцяў гэтага народа. Апроч таго, мы разам наведваем розныя мерапрыемствы, напрыклад, былі ва ўніверсітэце на свяце Чырвоных ліхтароў, прысвечаным заканчэнню кітайскага Новага года. Карацей, імкнёмся развівацца ўсебакова. І пры гэтым нікуды не спяшаемся, пакрысе засвойваючы матэрыял.

Як прызнаецца Мікіта, не толькі яны са студэнткай-кітаянкай вучаць сваіх старэйшых па ўзросце «студэнтаў». Гэта ўзаемны працэс узбагачэння чужым досведам. Юнак кажа, што нібыта па новаму пачаў успрымаць выраз «век жыві — век вучыся».

— У 20 гадоў хочацца ўсяго і адразу. Гледзячы на нашых «навучэнцаў», разумееш, што ўсё ў жыцці можна паспець, — гаворыць Мікіта. — Галоўнае, мець цярпенне, захоўваць раўнавагу і памятаць, што ніколі не позна распачаць справу, якая цябе па-сапраўднаму зацікавіла.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

*Ведай нашых!*

## ХТО ХУТЧЭЙШЫ ЗА БЕЛАРУСАЎ?

**Каманда клуба інтэлектуальных гульняў БДУ «Хто хутчэйшы» стала абсалютным пераможцам Адкрытага чэмпіянату ВНУ Расіі па інтэлектуальных гульнях і заваявала Кубак гэтых спаборніцтваў. Іх арганізатарам выступае Міжнародная асацыяцыя клубаў «Што? Дзе? Калі?»**

У склад зборнай увайшлі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі пяцікурснік Антон Іокаў, другакурснікі Ірына Бурак і Віктар Рэут, першакурснік Цімафей Пракапенка, пяцікурснік гістарычнага факультэта Аляксандр Марозаў і студэнт чацвёртага курса геаграфічнага факультэта Іван Зайкоў.

Праграма чэмпіянату ўключала чатыры гульні: «Што? Дзе? Калі?», «Свая гульня», «Міннае поле» і «Мазгавы штурм». У фінале ў Санкт-Пецярбургу ўдзельнічалі 64 каманды з Расіі, Украіны і Беларусі, а ўсяго ў адборачных турах былі прадстаўлены каля тысячы каманд з 36 ВНУ.

Гісторыя Адкрытага чэмпіянату ВНУ Расіі па інтэлектуальных гульнях вядзе адлік з 1995 года, калі ўпершыню ў Санкт-Пецярбургу прайшоў адкрыты чэмпіянат ВНУ. З 2010 года спаборніцтвы пашыраюць і фармат, і геаграфічныя межы. З гэтага часу Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт стаў пастаянным іх удзельнікам, заваяваўшы тытул абсалютнага чэмпіёна тройчы (у 2010, 2012 і 2014 гадах). Такім чынам перамагаць студэнты БДУ ўжо прызвычаіліся...

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Звычка выйграваць*

# «ВЯЛІКАЯ ГОНКА» ДА СОЧЫ ДАВЯЛА

**Трэці год запар навучэнцы Ходасаўскай сярэдняй школы Мсціслаўскага раёна выпраўляюцца ў кругасветнае падарожжа. Віртуальнае. Месяц захапляльнай барацьбы, 10 незабыўных цікавых тураў па розных краінах і кантынентах. Усё гэта арыгінальная, займальная і пазнавальная інтэрнэт-гульня для школьнікаў «Вялікія гонкі — 2016».**



**Вось яны — пераможцы!**

— Сёлета маршрут падарожжа для каманд «Новы дзень», «Дзеці новага пакалення» і «Негарадская моладзь» быў такім: Ізмір — Верона — Гамбург — Марсэль — Манчэстэр — Александрыя — Сан-Паўлу — Лос-Анджэлес — Бамбей — Адэлаіда. Цягам месяца ўдзельнікі здзейснілі віртуальнае падарожжа вакол Зямлі, пабываўшы па чарзе ў Турцыі, Італіі, Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі, Егіпце, Бразіліі, ЗША, Індыі і Аўстраліі. Школьнікі змаглі пазнаёміцца з гісторыяй, геаграфіяй, культурай, побытам, звычаямі, традыцыямі, нацыянальным адзеннем і самабытнай кухняй гэтых краін, — расказала **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Ходасаўскай СШ Тэрэса СЯМЁНАВА.**

Не менш цікавай была і геаграфія ўдзельнікаў «Вялікіх гонак». Масква і Краснадар, Хабараўск і Уладзівасток, Магадан і Уфа, Ліпецк і Новасібірск, Іванава і Касцюковічы, Магілёў і Мінск, Луганск і Данецк, Зугрэс і Ваўкавыск, Караганда і Паўладар, Душанбэ і Хаджэнт... Усяго ў кожнай узроставай групе змагалася больш за 30 каманд з розных навучальных устаноў Расіі, Беларусі, Украіны, Казахстана і Таджыкістана.

Літаральна са старту каманды з Ходасаў упэўнена захапілі лідарства ў сваіх узроставых групах і не саступілі яго да апошняга тура. Дапамагаў гульцам пракладваць маршрут нязменны штурман розных інтэрнэт-конкурсаў і алімпіяд, настаўнік інфарматыкі Аляксандр Уладзіміравіч Сямёнаў. Трэці год запар школьныя каманды пад яго кіраўніцтвам на фінішы аказваюцца ў ліку пераможцаў.

Вось іх імёны: Дар'я Шчарбакова, Аляксей Пруднікаў, Арцём Кабозаў, Марыя Зямцова — каманда «Новы дзень»; Антон Пруднікаў, Дзіяна Крупская, Святлана Рыбакова, Іна Валошына — каманда «Дзеці новага пакалення»; Уладзімір Іпатовіч, Вольга Іванова, Насця Рудкоўская, Паліна Зылева — каманда «Негарадская моладзь».

Але на гэтым гонка не скончана. У чэрвені ў алімпійскім Сочы плануецца правядзенне Міжнароднай інтэлектуальнай гульні «Вялікія гонкі» з удзелам лепшых каманд з блізкага і далёкага замежжа, куды атрымала запрашэнне і каманда Ходасаўскай сярэдняй школы. Каманда «Новы дзень» прадстаўляла Беларусь на аналагічных спаборніцтвах у 2014 годзе, адкуль вярнулася ў рангу пераможцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

*Дацягнуцца да зорак*

# КОСМАС СТАЎ КРЫШАЧКУ БЛІЖЭЙШЫМ

**Сонца і Месяц... Космас і Сусвет... Лятальныя апараты самых розных канструкцый... Іншапланецяне і касмічныя піраты... Усё гэта і не толькі рухалася, гучала і віравала падчас адмысловага мерапрыемства, зладжанага на радзіме касманаўта Раскосмасу Алега Навіцкага ў Чэрвені.**

...У мясцовай чацвёртай гарадской школе свае месцы за асобнымі столікамі занялі дзесяць каманд у складзе школьнікаў (і нават дашкольнікаў!), іх бацькоў і педагогаў. А на экране разам з урыўкамі з фантастычных фільмаў пра космас — не менш фантастычныя, але цалкам рэальныя відэазапісы, зробленыя нашым земляком Алегам Навіцкім падчас знаходжання на Міжнароднай касмічнай станцыі. З'яўленне кадраў фотахронікі з ім выклікала цэлы шквал апладысментаў. Не ведаю, што адчувала маці Алега, ганаровы член журы фестывалю Валянціна Эдуардаўна Навіцкая, калі паказалі ў запісе старт касмічнага карабля, на якім 23 кастрычніка 2012 года Алег накіраваўся ў Сусвет...

Зразумела, што касмічная тэматыка прысутнічала ва ўсім, найперш, у назвах каманд: «Арыён», «Сузор'е», «Гуманоіды», «Андрамеда», «Альтаір»... А таксама ў прапанаваных конкурсах: самапрэзентацыя «Зорны час», «Касмічны рынг», «Касмічны касцюм», «Касмічная страва». І адразу прыгадаўся герой акцёра Яўгена Лявонава ў фільме «Джэнтльмены ўдачы». Памятаеце яго загадкава дзіцячага садка?! «Вазьміце ў рукі касмічныя лыжкі...»



**На сцэне «запальвае» каманда «Альтаір» з СШ №2 г.п. Смілавічы.**

Дарэчы, «Касмічны рынг» прымусіў каманды папрацаваць галавой. Падчас яго вядучая чэрвеньскага інтэлектуальнага клуба «Ігумен» Ірына Вабішчэвіч прапанавала папулярную гульню «Медыязбука». Побач з нескладанымі пытаннямі былі і такія, якія «ўзяць» проста не ўяўлялася магчымым! У гэтым удзельнікі і госці пераканаліся даволі хутка, калі на экране пачалі з'яўляцца правільныя адказы.

«Як Гагарын?! Не было Гагарына!» — шумела зала. — «Быў! — усміхнулася Ірына Вабішчэвіч. — Толькі... у карнавальным касцюме! Канешне, было б прасцей, калі б паказалі яго фота ў скафандры!» У адказ пачуліся гучны смех і воплескі.

...На экране спраўна падлічваліся балы за кожны конкурс. Праўда, затым было аб'яўлена, што за касмічныя касцюмы і стравы абсалютна ўсе каманды атрымалі «пяцёркі». І як вынік — выключэнне экрана і выснова ад старшыні журы, начальніка аддзела адукацыі, спорту і турызму Чэрвеньскага райвыканкама Ларысы Асановіч: «Пераможцамі сталі ўсе!»

І заахвочванні за актыўны ўдзел таксама атрымаліся для кожнай каманды аднолькавымі: дыплом, прыз і... паездка ў музей авіяцыйнай тэхнікі, што размешчаны ў пасёлку Баравая пад Мінскам. А самым маленькім удзельнікам — ясляў-садку №3 г.Чэрвеня — паабяцалі яшчэ і паездку ў «МакДональдс».

**Святлана АДАМОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
7 04 2016 г.




# У ТРЭНАЖОРКУ — ПА ЭМОЦЫІ

**Вясна — залатая пара для фітнес-інструктараў. Бо менавіта цяпер большасць вырашае, што варта было б прывесці сябе ў парадак, і скупляе абанементы ў залы. Яшчэ б не спахапіцца, калі зграбныя дзяўчаты з карцінак у сацыяльных сетках нагадваюць, што да лета засталося ўсяго пару месяцаў...**

Гэта ўжо традыцыя — худзець з нагоды. Да Новага года, дня нараджэння, вяселля. Перад адпачынкам і пасля яго. Прычым традыцыя распаўсюджаная не толькі сярод дзяўчат. За тыдзень да таго як ехаць на мора, заўважыла, што старыя гантэлі, якія звычайна цягаю толькі я, ды і тое падчас прыборкі, «перакачавалі» ў іншы пакой. Высветлілася, што муж перад падарожжам таксама захацеў набраць форму. Некалькі вечароў ладзіў сабе трэніроўкі, а потым круціўся перад люстэркам, каб ацаніць вынікі. Не ведаю, наколькі істотным быў эфект, але муж дакладна застаўся задаволены. Эндарфіны ўсё ж такі дзейнічаюць.

«Падкажыце, чым заняцца, каб «падцягнуць цела» за кароткі тэрмін?» — пакідаюць дзяўчаты каментарыі на старонках фітнес-клубаў. І пакуль аматаркі пахудзеннях да сезона лічаць дні, за якія трэба паспець пазбавіцца ад лішніх кілаграмаў, мяне цікавіць: а ў астатні час як? Калі няма лета, паездкі на мора і іншых «выклікаў лёсу»? Паліто і цёплыя кофты, вядома, прыкрываюць недахопы фігуры, але каб 52-гі памер пераўтварыць у 44-ы — на такі цуд яны не здольныя. Хоць вынаходлівыя прадаўцы заўсёды прыдумаюць, што прапанаваць пакупніку, незадаволенаму сваёй знешнасцю. Цяпер якраз рэкламуюць чарговую навінку — эластычны пояс-гарсэт на талію. «Хочаце здавацца зграбнейшымі, але не можаце знайсці час на заняткі спортам? — чытаюць вашы думкі прадаўцы. — Проста купіце наш тавар!» Не, пояс не «спальвае» тлушч, як хацелася б, — усяго толькі ўцягвае жывот і бакі (вытворцы, праўда, запэўніваюць, што з часам фігура падладзіцца пад гарсэт і сама будзе трымаць форму). Карацей, ідэальны варыянт, каб перачакаць несезон. Праўда, сезон таксама давядзецца перачакаць — каб не раскрываць падман.

> **«Прыгожы мужчына — пузаты мужчына», — лічаць на далёкім узбярэжжы, бо наесці жывот могуць сабе дазволіць толькі багатыя людзі.**

Але згаджуся: вясна — цудоўная нагода заняцца спортам. Хоць бы таму, што для гэтага не абавязкова ісці ў залу. Выходзь на прабежку (толькі не ўздоўж аўтадарог: загазаванае паветра ніяк не спрыяе аздараўленню) ці садзіся на веласіпед — і наперад. Да таго ж трэніроўкі на вуліцы больш эфектыўныя. Навукоўцы сцвярджаюць, што падчас іх мы трацім ледзь не на 15 працэнтаў больш калорый, чым калі застаёмся ў зале. Ведаю, што некаторыя клубы, як толькі пацяплее, пераносяць частку заняткаў на суседні стадыён ці спартыўную пляцоўку.

Калі ў нас вулічны фітнес толькі ўваходзіць у моду, то ў многіх краінах гэта традыцыя. Напрыклад, у в'етнамскім горадзе Нячанг зранку і ўвечары на пляж, апроч турыстаў, падцягваюцца мясцовыя жыхары — на гімнастыку. Бабулі і дзядулі (ніколі не здагадаешся пра іх узрост!) паволна размінаюцца, моладзь праводзіць час на трэнажорах (вельмі простых па канструкцыі, па сутнасці, крыху дапрацаваных турніках). А ў парку пад магнітафон праходзяць заняткі па танцах. Самае цікавае пры гэтым, што ў зграбных в'етнамцаў худым быць не модна. «Прыгожы мужчына — пузаты мужчына», — лічаць на далёкім узбярэжжы, бо наесці жывот могуць сабе дазволіць толькі багатыя людзі.

Нашы дзяўчаты на здароўе, на жаль, забываюцца. Каб хутчэй дасягнуць вынікаў, адразу і на жорсткую дыету «сядаюць», і ў трэнажорку безлімітны абанемент бяруць. Па прынцыпе «чым цяжэй, тым лепш». Памятаю, як адна наша кліентка ў целе, якая дагэтуль займалася пілатэсам, вырашыла змяніць трэніроўкі на больш інтэнсіўныя сілавыя. Ледзь адбыўшы занятак, потым яшчэ колькі хвілін сядзела ў раздзявальні — адыходзіла ад фізічных нагрузак. І так кожны раз. Навошта такія ахвяры? Старацца і пераадольваць сябе, вядома, трэба (ёсць адно цудоўнае правіла: зрабі столькі паўтораў, колькі зможаш, і яшчэ плюс два), але ж не да паўнепрытомнага стану.

У фітнес, мне здаецца, варта ісці па эмоцыі. Бо калі ваша мэта проста пахудзець, паверце, карэкціровак у харчаванні будзе дастаткова. А вось эндарфіны, праз якія вы адчуваеце сябе прыгажэйшымі яшчэ да таго, як эфект надышоў, ніякі эластычны пояс не замяніць.

*У актыўным рытме*

# «БЕГ ДЛЯ МЯНЕ — ЯК «ДРУГОЕ ДЫХАННЕ»

**Міхаіл РАМАНАЎ ужо дзевяць гадоў займаецца прафесійным бегам. Летась у ліпені ўпершыню за сваю спартыўную кар'еру хлопец быў адабраны на чэмпіянат Еўропы сярод моладзі, які праходзіў у Эстоніі. Але праз сваю празмерную ўпэўненасць добра выступіць не атрымалася. Гэта стала добрым досведам для спартсмена. І праз паўмесяца на чэмпіянаце ў Гродне бягун стаў трэцім на дыстанцыі 400 метраў з бар'ерамі, праз дзве гадзіны — другім у эстафеце 4 па 100 метраў. А на наступны дзень, нягледзячы на стомленасць і боль у мышцах, — чатырохразовым чэмпіёнам Беларусі ў эстафеце на 4 па 400 метраў.**

***— Міхаіл, з чаго ўсё пачалося?***

— Калі мне было 13 гадоў, я вырашыў паўдзельнічаць у школьным кросе, бо заўсёды хацеў быць першым. Але не перамог, і гэта моцна зачапіла. Тады звярнуўся па дапамогу да трэнера Васіля Барсука. І праз два гады выйграў! У 9 класе мяне ўзялі ў Гродзенскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага рэзерву. Пасля быў факультэт фізічнай культуры ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Паралельна вучыўся на ваеннай кафедры. Пры гэтым не забываў і пра сваю спартыўную кар'еру. Прызнаюся, гэта было нялёгка!

Дарэчы, з дапамогай другога майго трэнера Леаніда Леанідавіча Вяршыніна, чэмпіёна Беларусі і ўдзельніка Алімпіяды-2000, мне ўдалося выканаць нарматыў майстра спорту, адабрацца на той самы чэмпіянат Еўропы сярод моладзі і стаць прызёрам чэмпіянату Беларусі на дыстанцыі 400 метраў з бар'ерамі.


**На леташнім чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь. 400 метраў з бар'ерамі. Міхаіл — у цэнтры.**

***— Як звычайна праходзяць трэніроўкі? Што адчуваеш перад стартам?***

— Не заўсёды гладка. Самае страшнае, што можа іх сапсаваць, — гэта траўмы. Таксама многае ў падрыхтоўцы залежыць ад калектыву. Перад стартам адчуваю выкід адрэналіну! Але калі ён «перакіпіць», то добрага выніку не атрымаецца і ўсе намаганні і знясільваючыя трэніроўкі будуць марнымі.

Цяпер жыву і трэніруюся ў Віцебску. Пасля Гродна мне прапанавалі тут вучобу ў тэхналагічным універсітэце. Я прадстаўляю яго на спаборніцтвах. Зімой часта ездзім у Магілёў, дзе знаходзіцца лепшы лёгкаатлетычны манеж краіны. Калі-нікалі выязджаем за мяжу — у горы. Там нізкі ўзровень кіслароду, гэта вельмі добра для паляпшэння вынікаў.

***— Якія ў цябе планы на будучыню?***

— Мне падабаецца экстрым, таму скачу з «тарзанкай» з моста, яшчэ хацеў бы скокнуць з парашутам. Увогуле актыўны адпачынак — маё хобі. А спорт... Ён дае «другое дыханне» ў жыцці, дапамагае загартоўваць характар. Канешне, хацелася б звязаць будучыню з бегам.

Многія з нас імкнуцца стаць першымі ў сваёй справе. Але нехта пры першым падзенні адразу апускае рукі, а хтосьці падымаецца, каб даказаць усім, і ў першую чаргу сабе, што ён можа стаць лепшым з лепшых. І Міхаіл Раманаў даказаў гэта.

**Таццяна ЛАУШ,**
**студэнтка ІІІ курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Я. Купалы.**

# САМЫ ВЕТЛІВЫ БАКСЁР НА РЫНГУ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ.»)*

У жаночым боксе бой праходзіць у чатыры раўнды па дзве хвіліны. У Беларусі няшмат прадстаўніц прыгожага полу займаюцца гэтым відам спорту. Таму на спаборніцтвах здараецца, што табе супрацьстаяць толькі дзве-тры саперніцы. Асабліва ў дзіцячых групах, дзе фарміраванне пар робіцца з улікам не толькі вагі, але і ўзросту. Бываюць нават сітуацыі, калі перамога прысуджаецца аўтаматычна, таму што няма канкурэнтаў. Як гаворыць Кацярына, «у бокс трэба толькі прыйсці — і ты ўжо пераможца».


**Трэнер Руслан ЛЯВІЦКІ і яго выхаванкі.**

— Некалькі разоў, каб не прапускаць трэніроўкі, я хадзіла ў групу для юнакоў. У боксе ўсе роўныя. І там ніхто цябе шкадаваць не будзе. У групе восем-дзевяць хлопцаў і з кожным па чарзе трэба адпрацаваць удары. І толькі адзін з іх падумае, што ты дзяўчына. І тое, калі ты яму скажаш: я забыла капу, не бі, калі ласка, па зубах. Але праз хвіліну і ён ужо можа не памятаць аб гэтым. І ты толькі молішся, каб у цябе зубы не выпалі. На адпрацоўках няма розніцы, які ў цябе рост, вага ці пол. Аднойчы мы з хлопцам толькі сталі (я яшчэ не скончыла размінацца), а ён ужо «прапісвае» мне адзін удар. Я не паспяваю паставіць руку і атрымліваю проста ў нос. У мене галава так і адляцела назад. А ён і сам засмуціўся, што не ўтрымаў сябе пад кантролем. Але да такіх сітуацый у боксе трэба быць гатовым, — расказвае мая суразмоўца.

У жыцці Кацярыне, на шчасце, не даводзілася карыстацца сваімі байцоўскімі навыкамі. На рынгу яна «самы ветлівы баксёр». Нават можа папрасіць прабачэння ў сваёй саперніцы за моцныя ўдары.

— Ёсць стэрэатып, што жанчыны, якія займаюцца боксам, становяцца падобнымі да мужчын. Насамрэч, да нас прыходзяць вельмі розныя людзі. Часам нават здагадацца нельга, што вось гэтай дзяўчыне падабаецца баксіраваць. Але, з іншага боку, сапраўды, у боксе вельмі шмат спартсменак з кароткімі стрыжкамі і грубаватымі манерамі. Калі глядзіш на іх, згаджаешся, што стэрэатып узнік не на роўным месцы.

Некаторыя лічаць, што дзяўчаты ідуць у баявыя віды спорту, каб мець магчымасць за сябе заступіцца. Кацярына гаворыць, што бокс у канфліктнай сітуацыі не памочнік:

— Я сказала б, што ў такім выпадку ў дзяўчат больш шанцаў збегчы ад хулігана. Бокс вельмі добра трэніруе трываласць, нагрузка ідзе на ўсе цягліцы. Ёсць, напрыклад, аздараўленчы бокс, дзе працуюць толькі са снарадамі. І для дзяўчат, каб пахудзець і прывесці сябе ў форму, — гэта адзін з найлепшых спосабаў. Найвялікшая нагрузка ідзе на ногі. На іх мы ўхіляемся, моц удару таксама ідзе ад ніжняй часткі цела. Ногі лічацца важнейшымі за рукі спартсмена.

Для таго, каб мець перавагу перад чэмпіянатам Беларусі мінулай вясной, Кацярына скінула чатыры кілаграмы за два тыдні. Баксёру лепш важыць менш, таму перад спаборніцтвамі ўсе імкнуцца прывесці сябе ў патрэбную форму. Тады больш шанцаў, што сапернік будзе ніжэй за цябе. А ў боксе гэта азначае, што ў яго будуць больш кароткія рукі, і перавага будзе на тваім баку.

— Гэты від спорту робіць мяне больш спакойнай. Ён здымае ўсю негатыўную энергію, сысці з трэніроўкі ў дрэнным настроі амаль што нерэальна. У якой бы дэпрэсіі я ні прыйшла, заўсёды сыходжу шчаслівая, — канстатуе Кацярына. — Па-першае, таму, што я нешта зрабіла для сябе. Адразу адчуваеш, што добра папрацавала. Па-другое, заўсёды шмат гумару: жартуем, смяёмся, кожны раз абавязкова хтосьці што-небудзь учыніць! Нягледзячы на тое, што мы б'ёмся, атмасфера заўсёды вельмі сяброўская. Па вялікім рахунку, гэта заслуга нашага трэнера Руслана Лявіцкага. Ён заўсёды нас падтрымлівае, шмат укладвае і ў нас, і ў спорт. А гэта для мяне вельмі важна.


**Гэты від спорту развівае ўсе групы цяглiц. А вы так можаце?**

Фота Кацярыны ВАРВАШЭНІ.

**Надзея АНІСОВІЧ,**
**студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Пераадолець сябе*

# АНЁЛ З МОЦНЫМ ДУХАМ



## МАДЭЛЬ З ДЦП НЕ ЗВАЖАЕ НА СТЭРЭАТЫПЫ

**Яна заражае сваім аптымізмам, уражвае бясстрашнасцю і здзіўляе поглядамі на жыццё. Ангеліна Уэльская — першая беларуская мадэль з ДЦП — спрабуе ламаць стэрэатыпы не толькі ў дачыненні да людзей з адрознымі магчымасцямі. Яна ўпэўнена, што кожны чалавек здольны дасягнуць поспеху, калі не будзе ствараць уяўныя межы альбо дазваляць іншым навешваць на сябе розныя ярлыкі.**

У 17 гадоў Ангеліна адмовілася ад інваліднай каляскі, хоць напачатку абыходзіцца без яе было фізічна складана. Затое так яна змагла атрымліваць вышэйшую адукацыю, адчуць «смак» студэнцкага жыцця — сядзець з равеснікамі на лекцыях, выбірацца ў кавярні пасля экзаменаў. Пакуль Ангеліна рухаецца з падтрымкай, але штодзень стараецца прайсці не менш за кіламетр, і кожная такая прагулка для яе як маленькі подзвіг. Яна прызнаецца, што любіць спорт, трэніруе прэс і нават спрабавала з'ехаць на горных лыжах.

Ангеліна робіць кар'еру ў мадэльным бізнесе і ўсяму свету паказвае, якія крэатыўныя, моцныя духам і незалежныя ад стэрэатыпаў людзі жывуць у Беларусі. Напачатку ў яе было толькі вялікае жаданне стаць мадэллю. Яна глядзела шоу Тайры Бэнкс і запісвала парады, чытала Станіслаўскага. Працавала над сабой перад люстэркам, прыдумляла цікавыя ідэі, на якія адгукаліся фэшн-фатографы. Яна навучылася не заўважаць крыўдных слоў, нават пра свой псеўданім «Анёл Уэльса» (проста скарочаныя сапраўдныя імя і прозвішча) ёй даводзілася чуць: «Як такая пакваплілася на падобнае». Яна прызнаецца, што мадэлінг — складаная справа, каб дасягнуць поспеху, важна не толькі ўмець сябе падаць, трэба запасціся цярплівасцю, не зважаць на адмовы, неразуменне і нават бруд, без чаго не абыходзіцца, калі спрабуеш прасоўвацца ў адзіночку, без магутных апекуноў і сувязяў. Было і такое, што пад выглядам працы ў мадэльным агенцтве дзяўчыну зазывалі аказваць секс-паслугі.

Цяпер з Ангелінай пачала супрацоўнічаць Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам. Удзельнічаючы ў здымках сацыяльнай рэкламы, дзяўчына расказвае маладым людзям пра новыя магчымасці, заяўляе, што важна не страціць чалавечую годнасць і веру ў сябе.

Ангеліна не баялася складанасцяў — і выйгравала. Яна пазнаёмілася з многімі вядомымі цікавымі асобамі шоу-бізнесу, выходзіла на подыум на Тыдні моды ў Маскве і годна прадстаўляла нашу краіну. Яе здымкам у ніжняй бялізне англічане ставяць лайкі і пакідаюць водгукі кшталту «абсалютная прыгажосць», амерыканцы запрашаюць да сябе, запэўніваюць, што ў дзяўчыны ёсць вялікі патэнцыял для таго, каб пакарыць іх мадэльны рынак ды і прыўнесці новае, тым больш што Ангеліна — адна з першых прафесійных мадэляў з ДЦП у свеце. Дзяўчына нават знялася ў фільме, дзе, па сутнасці, іграла саму сябе. У яе шмат ідэй і планаў, сярод якіх распрацоўка брэнда артапедычнага абутку, праца ў сферы высокай моды. І, безумоўна, Ангеліна хоча быць фінансава незалежнай — гатова заключыць кантракт з вялікімі кампаніямі і рэкламаваць іх тавары (тым больш што такі вопыт у яе ўжо ёсць). Ну, і як жа без гэтага, — яна хоча стварыць сям'ю і выгадаваць дваіх дзетак.

**Яна навучылася не заўважаць крыўдных слоў, нават пра свой псеўданім «Анёл Уэльса» ёй даводзілася чуць: «Як такая пакваплілася на падобнае».**

— Пражыць у чатырох сценах — не для мяне, — прызнаецца дзяўчына. — Нават маленькай увесь час уяўляла сябе папулярнай — спявачкай ці актрысай. Мадэлінг — гэта і любімая справа, і зыход ад складанай рэальнасці. Я вырвалася з нейкай шэрасці, цемры, пачала адчуваць, што такое свята. Мадэльная справа мяне моцна змяніла, я стала больш упэўненай, моцнай, мне прасцей завязваць новыя знаёмствы. Здаецца, я і хадзіць стала лепш.

Калі плывеш супраць цячэння, атрымліваеш развіццё. Чым бы я ні вырашыла займацца, для мяне гэта заўсёды, як маленькая рэвалюцыя.Так, я адзіная студэнтка з асаблівасцямі, якая скончыла ўніверсітэт культуры па спецыяльнасці «менеджмент сацыяльна-культурнай дзейнасці». Маладыя людзі з цэрабральным паралічом вучацца ў асноўным на бібліятэкараў, і пакуль яшчэ ніхто не адважыўся асвойваць прадзюсаванне і шоу-бізнес.

Я марыла аб тэатральнай прафесіі — і цяпер вучуся ў магістратуры Акадэміі мастацтваў. Нядаўна ўпершыню выйшла на прафесійную тэатральную сцэну, няхай пакуль толькі ў ролі фотамадэлі, але я ледзьве не заплакала, бо адчувала, што гэта маё, вось яшчэ адна мая мара збываецца. Я працую над дысертацыяй аб постдраматычным тэатры, пішу сцэнарый спектакля, у якім у якасці акцёраў могуць быць задзейнічаны людзі з адрознымі магчымасцямі, мару стварыць тэатр, у якім будуць спалучацца мода і драма. І наконт мадэлінгу ў мяне ёсць планы. Мне хочацца заявіць пра сябе ў высокай модзе, там ёсць асаблівы дух і нават філасофія. У той жа час я стаўлю сабе задачу выйсці на подыум і ў якасці ўдзельніцы шоу-паказу бялізны ад вядомай кампаніі-вытворцы «Вікторыі Сікрэт». Гэта вяршыня для прыгожых, сексуальных дзяўчат, бо адчуваю, што ўнутры я такая ж, як яны.



...Ёй пішуць з усяго свету, захапляюцца, просяць парады, дзякуюць, нават спрабуюць яе капіраваць. Былі і лісты ад людзей, якія прызнаваліся, што ім не хацелася жыць. Напрыклад, ад дзяўчыны з Грузіі, што стала інвалідам у выніку ваеннага канфлікту, альбо ад хлопца з ДЦП з Кітая. Ангеліна Уэльская для іх — як анёл, што нясе надзею.

— Я стараюся адказваць усім, хто мне піша. Але разумею, што не магу ўсім дапамагчы. Часта людзі не чуюць маіх парад, яны патрабуюць, просяць, ціснуць на жаль, маўляў, «мы з табой адной крыві, дапамажы нам стаць мадэлямі». Трэба ісці сваім шляхам, задумацца, чаго хочаш ад жыцця. Часам людзі не ведаюць, што ім трэба. Яны павінны вызначыцца з мэтамі, мець нейкі матэрыял, праекты, ідэі, прадумаць, як сябе падаваць. Інтэрнэт адкрывае магчымасці для камунікацыі. А яшчэ важна не адступаць, калі адразу не атрымліваецца...

***P.S.* Ангеліну заўсёды падтрымлівае сям'я. Нельга не захапляцца гэтымі людзьмі. Яны не страчваюць аптымізму і зрабілі ўсё магчымае для таго, каб іх дачка вырасла шчаслівай і жыццярадаснай. У іх шмат чаму можна павучыцца.**

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*Майстар-клас*

# СА СТЫЛЕМ У ГАЛАВЕ

## Цырульнік — пра сумніўную касметыку і модныя прычоскі

**«Ніколі не кажы «ніколі». Я раней была ўпэўнена, што нізашто не буду ўдзельнічаць у конкурсах, не маё гэта. А бачыце, як атрымалася». Таццяна ШЫШМОЛІНА — адна з найлепшых цырульнікаў. Дзяўчына была ў складзе беларускай каманды, якая перамагла на міжнародным фестывалі прыгажосці «Неўскія берагі» ў Піцеры. Сама Таццяна прывезла з конкурсу шэсць кубкаў, не лічачы ўжо тых узнагарод, якія атрымалі яе вучні (Таццяна выкладае ў Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы лёгкай прамысловасці і бытавога абслугоўвання насельніцтва). У перапынку паміж конкурсамі і парамі ў навучэнцаў мы распыталі майстра пра таямніцы прафесіі.**



Пераможца Таццяна ШЫШМОЛІНА.

***— Як становяцца найлепшымі ў вашай сферы?***

— Я вучылася на працы. І шкадую, што калісьці ў свой час не надала гэтаму ўвагі ў каледжы. Увогуле, у нас у краіне арганізуецца шмат семінараў для тых, хто займацца цырульніцкім майстэрствам прафесійна. Ёсць тэарэтычныя майстар-класы, ёсць з адпрацоўкай, калі пасля лекцыі практыкуемся на манекен-галовах ці кліентах. Для развіцця варыянтаў маса. Было б жаданне.

***— З практычнымі семінарамі зразумела. А што расказваюць на тэарэтычных?***

— Як правіла, знаёмяць з нейкім новым касметычным прадуктам. Расказваюць пра догляд валасоў, будову воласа, псіхалогію і этыку абслугоўвання кліентаў. Плюс, у залежнасці ад таго, што прэзентуюць, нагадваюць асновы каларыстыкі ці хімзавіўкі. Таго, што ёсць у падручніках для студэнтаў, не заўсёды хапае для працы. На семінарах звяртаюць увагу на нюансы, дзеляцца напрацаванымі «фішкамі», якіх вы не знойдзеце ў сеціве. Гэтыя веды купляюцца за грошы. Чым больш майстар у сябе ўклаў, чым больш наведаў і пагледзеў, тым больш ён каштуе як прафесіянал.

***— Наконт навінак. Якія сумніўныя прадукты вы сустракалі?***

— Нумар адзін сярод іх — гэта шампунь для валасоў «два ў адным», напрыклад, шампунь-кандыцыянер. Таму што шампунь ачышчае валасы за кошт таго, што мае шчолачнае асяроддзе, раскрывае лускавінкі. Бальзам жа, які наносіцца пасля мыцця і закрывае лускавінкі, мае кіслае асяроддзе. Калі іх змешваць, атрымліваецца не тое і не тое. Няма белай хны і той, якая пазбаўляе колеру. Але кліент купляецца на гэту назву, бо ведае, што хна — раслінны прадукт, а значыць, карысны. А па факце белая «хна» гэтак жа псуе валасы, як і пергідроль, які выкарыстоўвалі ў 1990-я. Прадаецца вельмі шмат няякасных бытавых фарбаў для валасоў. Але людзі іх бяруць, бо прафесійныя нашмат даражэй каштуюць.

***— Як праходзяць спаборніцтвы цырульнікаў?***

— У кожнага конкурсу ёсць рэгламент, дзе ўсё падрабязна прапісана. Нават якая даўжыня валасоў мусіць быць да выканання работы і пасля, які іх колер дазволены, які інструмент можна выкарыстоўваць. У агульных рысах, каб пакінуць месца для творчасці, тлумачыцца, што павінна сабой уяўляць прычоска: мусіць яна адпавядаць напрамкам конкурснай моды ці быць набліжанай да той, якую можна прапанаваць кліенту ў салоне. Удзельнікі прыходзяць са сваімі падрыхтаванымі мадэлямі, у якіх павінен быць створаны цэласны вобраз — ад манікюру да макіяжу. Суддзі ацэньваюць нават, ці падыходзіць сукенка, якую надзеў канкурсант на сваю мадэль, да той прычоскі, што ён стварае. Час працы абмежаваны: 25-35 хвілін на жаночую прычоску, круціся як хочаш. На конкурсную стрыжку 40 хвілін адводзяць. У мужчынскіх цырульнікаў часу яшчэ менш. Пакуль ты працуеш, суддзі сочаць за тым, каб работа строга адпавядала рэгламенту. Напрыклад, у прычосцы не павінна быць сродкаў падтрымкі: падкладных валікаў ці каркасаў. Глядзяць, каб яна была выканана чыста, пасавала мадэлі.



Такую складаную прычоску дзяўчына робіць усяго за паўгадзіны.

***— Даўно цікавіла пытанне: чаму прычоскі конкурснай моды такія дзіўныя? Яны ж абсалютна не падыходзяць для будзённага жыцця.***

— Такія прычоскі — найвышэйшая праява майстэрства. Яны вельмі складаныя, дэманструюць фантазію і тэхнічнасць цырульніка. А для паўсядзённага жыцця, як правіла, падыходзяць толькі некаторыя элементы конкурснай моды. Нецікава, калі ацэньваюцца проста салонныя работы.

***— Адкуль прыходзіць мода на прычоскі?***

— Апошнім часам яе ствараюць топавыя стылісты. Напрыклад, расіянін Руслан Тацянін перыядычна выпускае свае калекцыі прычосак. Не менш вядомы сочынскі майстар Георгій Кот, шмат ідэй мы бяром у яго. Штосьці з навінак прэзентуецца на выставах, якія праходзяць падчас конкурсаў. Або цырульня, або касметычная фірма са сваімі стылістамі праводзіць майстар-класы.

***— Якія жаночыя стрыжкі цяпер актуальныя?***

— Нарэшце губляюць папулярнасць выгаленыя скроні. Цяпер мода больш скіравана на ўкладкі і афарбоўванне. Паступова ўваходзіць у жыццё калараванне. Але пасмы валасоў фарбуюцца не ў яркія колеры, а ў пастэльныя — блакітны, ружовы, персікавы, бэзавы. Усё яшчэ папулярнае амбрэ (спосаб афарбоўвання, калі цёмны тон плаўна пераходзіць у светлы. — **Аўт.**).

***— А што наконт прычосак?***

— У модзе гафрэ. Дарэчы, увёў яго Руслан Тацянін. Гафрэ, памятаю, было папулярным, яшчэ калі я ў школу хадзіла. І цяпер вяртаецца зноў. Прычым цікава, што і інструмент развіваецца. Шчыпцы могуць рабіць на валасах «хвалі» рознай формы: трохвугольнай, прамавугольнай.

***— Калі казаць пра хлопцаў, што ім прапануюць?***

— Сыходзіць з моды андэркат (калі валасы на скронях кароткія, а на макушцы і патыліцы — даўгія), гэтыя хвасты, чубы... Хоць кок (прыўзнятыя над ілбом доўгія валасы. — **Аўт.**) паранейшаму ў модзе. Стрыжкі становяцца графічнымі, больш падобнымі да класікі. Цяпер вельмі папулярна адкрываць барбершопы — мужчынскія цырульні. Некаторыя з іх могуць нагадваць клубы.

***— Што лепш: пастаянства ці эксперыменты?***

— А як каму падабаецца. Мірэй Мацье, напрыклад, ходзіць з адной стрыжкай усё жыццё і добра сябе адчувае.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
07 04 2016 г.

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - Капитальное строение, инв. № 400/С-69051 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), площадью 220,4 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/2;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-69021 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 243,9 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/1;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-69106 (назначение – здание многофункциональное), площадью 1209,3 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97342 (назначение – сооружение неустановленного назначения), площадью 2070,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий столярной мастерской, блока складов и механического цеха, склада КиПа;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97348 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 68,6 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока складов и механического цеха;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97337 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 81,3 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая канализационная сеть к блоку складов;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97332 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 104,5 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к блоку складов и механическому цеху;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97387 (назначение – сооружение специализированное энергетики), протяженностью 228,7 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10кВ до ТП-3 до ТП-4;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97379 (назначение – сооружение специализированное энергетики), протяженностью 61,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к блоку складов и механическому цеху;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-85886 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 343,9 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- шкаф распределительный ПР-24-7208;<br>- трансформаторная подстанция 2 РТ 1000/10 № 1;<br>- распределительный пункт ПР-24-11-7205;<br>- трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2;<br>- трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2;<br>- распределительный пункт ПР-24-7210-54УЗ;<br>- теплосчетчик ТЭМ 05м, ДУ=80;<br>- теплосчетчик ТС-07ХХ-88 «Струмень»;<br>- туя (1 единица) |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | - кадастровый номер 440100000002008242, площадью 0,9480 га (назначение – для обслуживания зданий столярной мастерской (инвентарный номер 400/С-69051), блока складов и механического цеха (инвентарный номер 400/С-69106), склада КиПа (инвентарный номер 400/С-69021)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 К<br>- кадастровый номер 440100000002006868, площадью 0,0007 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006869, площадью 0,0007 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006871, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006872, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006873, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006874, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006875, площадью 0,0037 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006876, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006877, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006878, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети); кадастровый номер 440100000002006879, площадью 0,0312 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети), расположенные по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 |
| **Начальная цена продажи** | 1 833 097 644 (один миллиард восемьсот тридцать три миллиона девяносто семь тысяч шестьсот сорок четыре) белорусских рубля без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 91 654 882 (девяносто один миллион шестьсот пятьдесят четыре тысячи восемьсот восемьдесят два) белорусских рубля |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - Капитальное строение, инв. № 400/С-89984 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – ангар), площадью 449,7 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-69050 (назначение – здание специализированное трубопроводного транспорта, наименование – насосная станция), площадью 187,6 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж/1;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97340 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 105,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания автоматической насосной станции, резервуара для воды и здания ангара;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-58952 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар для воды на 500 куб.м), объемом 500 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97349 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 43,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию насосной станции;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97339 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью 43,85 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая сеть к резервуару для воды;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97334 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 24,45 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию автоматической насосной станции;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97386 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 267,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения здания автоматической насосной станции, резервуара для воды и здания ангара;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97378 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 119,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданию автоматической насосной станции;<br>- тополь (2 единицы); - каштан (14 единиц) |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 440100000002008244, площадью 0,4859 га (назначение – для обслуживания здания автоматической насосной станции (инв. № 400/С-69050), резервуара для воды на 500 куб.м (инв. № 4660) и здания ангара (инв. № 400/С-89984)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж |
| **Начальная цена продажи** | 740 170 553 (семьсот сорок миллионов сто семьдесят тысяч пятьсот пятьдесят три) белорусских рубля без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 37 008 528 (тридцать семь миллионов восемь тысяч пятьсот двадцать восемь) белорусских рублей |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - Капитальное строение, инв. № 400/С-63419 (назначение – здание нежилое, наименование – здание установки контактного выпаривания), площадью 662,4 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Д;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97341 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 165,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания установки контактного выпаривания, резервуара;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-58964 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 250 куб.м пожарно-аварийный водоем), объемом 250 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97347 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 365,10 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию установки контактного выпаривания;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97335 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 22,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию установки контактного выпаривания;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97385 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 103,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения здания установки контактного выпаривания, резервуара;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97382 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 117,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданию установки кинтактного выпаривания;<br>- шкаф распределительный ПР-24-7208; - липа (4 единицы); - тополь (2 единицы) |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 440100000002008243, площадью 0,2356 га (назначение – для обслуживания здания установки контактного выпаривания (инв. № 400/С-63419), резервуара на 250 куб.м ПАВ (инв. № 4702)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Д |
| **Начальная цена продажи** | 678 566 966 (шестьсот семьдесят восемь миллионов пятьсот шестьдесят шесть тысяч девятьсот шестьдесят шесть) белорусских рублей без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 33 928 348 (тридцать три миллиона девятьсот двадцать восемь тысяч триста сорок восемь) белорусских рублей |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **ЛОТ 4** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - Капитальное строение, инв. № 400/С-69029 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – блок предочистки), площадью 320,4 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Е;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97343 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 390,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания блока предочистки;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97350 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 12,50 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока предочистки;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97331 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 190,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию предочистки;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97381 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 80,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть к зданию блока предочистки;<br>- липа (12 единиц); - шкаф распределительный; - дерен белый (1 единица) |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 440100000002008245, площадью 0,2180 га (назначение – для обслуживания здания блока предочистки (инв. № 400/С-69029)) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Е |
| **Начальная цена продажи** | 861 339 426 (восемьсот шестьдесят один миллион триста тридцать девять тысяч четыреста двадцать шесть) белорусских рублей без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 43 066 971 (сорок три миллиона шестьдесят шесть тысяч девятьсот семьдесят один) белорусский рубль |
| **Условия аукциона** | Без условий |

| | |
|---|---|
| **ЛОТ 5** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - Капитальное строение, инв. № 400/С-17193 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, наименование – главный производственный корпус), площадью 29971,7 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, состоящее из: капитальное строение, инв. № 400/D-152212 (назначение – производственное помещение, наименование – главный производственный корпус), площадью 29418,5 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-2 и капитальное строение, инв. № 400/D-123114 (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения), площадью 523,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-1;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-69015 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – автоматическая насосная станция пожаротушения), площадью 160,5 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/2;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-69014 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – КПП-120), площадью 19,6 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/1;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97344 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 7950,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий и сооружений главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-86338 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – резервуар для хранения 8% раствора пенообразователя), объемом 250,0 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-58965 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 1000 куб.м), объемом 1000 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-89988 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – площадка под емкости), площадью застройки 119,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-85888 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 586,05 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97346 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 325,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-89982 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1940,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97338 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1189,75 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая сеть к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-89983 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная напорная канализация), протяженностью 243,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-86070 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная тепловая сеть), протяженностью 729,35 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-62631 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – паропровод), протяженностью 457,95 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55845 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внеплощадочная кабельная линия, напряжением 10 кВ), протяженностью 1018 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-74384 (назначение – сооружение специализированное связи, наименование – внутриплощадочная телефонная канализация), протяженностью 193,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97333 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 582,90 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-74876 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 227,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-74877 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 991,36 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97384 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 420,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, внутриплощадочная сеть наружного освещения зданий и сооружений главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97380 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 353,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-97392 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ), протяженностью 473,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10 кВ до ТП-1, от ТП-1 до ТП-2;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55838 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная напорная канализация), протяженностью 277,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55842 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный производственный водопровод), протяженностью 1305,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-85887 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – мостовое сооружение), протяженностью 48,00 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;<br>- Внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ марки ААБл3*95, протяженностью 155 м;<br>- Внутриплощадочная кабельная линия 0,4 кВ марки АВБбШв, протяженностью 70 м;<br>- пункт распределительный (50 единиц);<br>- камера КСО-272 (2 единицы);<br>- трансформаторная подстанция 2 КТП 1000/10 ТП-4;<br>- камера КСО – 3 комплекта;<br>- панель ЩО-7024;<br>- шкаф вводно-распределительный ВРУ-1;<br>- трансформатор масляный ТМЗ-1000/10 Т-4 (2 единицы);<br>- трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2 (4 единицы);<br>- трансформаторная подстанция 2 КТП 1000/10,3 (2 единицы);<br>- трансформаторные ячейки КРУ-821-00848 (2 единицы);<br>- шкаф S-9522-13;<br>- вентилятор центробежный с эд/двиг. (7 единиц);<br>- камера орошения КТЦ-2-63;<br>- бак сбора выпарки 10 м.куб.;<br>- камера орошения КТУ-2-40 (7 единиц);<br>- кондиционер (6 единиц);<br>- бак сбора конденсата 10 м.куб. (2 единицы);<br>- пресс для угаров АРО-1 (2 единицы);<br>- смесовая машина;<br>- красильный аппарат типа «Линдер»;<br>- набивная машина НВ-150;<br>- центрифуга ФМК-1521-К1;<br>- механизированный лабаз ЛРМ-40М-1;<br>- кисловочная машина с отжимными валами;<br>- аппарат красильный АКДУ-601 с поддонами 2 (единицы);<br>- разрыхлительно-трепальный агрегат АРТ-120Ш;<br>- механизированный лабаз ЛРМ-40М-1 (2 единицы);<br>- бункер пылеулавливающий 3730*2800*2310 (8 единиц);<br>- агрегат для сушки волокна АСВ-120-Ш;<br>- красильно-промывная машина МКП-Ш-1;<br>- таль электрическая г/п 1т (2 единицы);<br>- дизель-генератор ДГА-3-48;<br>- туя (4 единицы);<br>- липа (4 единицы);<br>- бак-мешалка объемом 0,63 куб.м;<br>- бак-мешалка, объемом 1,6 куб.м;<br>- сборник стальной эмалированный 2,0 куб.м;<br>- станина и барабан спирально-бильного волчка;<br>- настил пола стальной с просечкой 25 кв.м;<br>- двутавр стальной горячекатаный № 26 (47 м);<br>- двутавр стальной горячекатаный № 10 (15 м);<br>- двутавр стальной горячекатаный № 18 (27 м);<br>- швеллер стальной горячекатаный № 18 (44 м);<br>- уголок стальной горячекатаный № 50 (20 м) |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | - кадастровый номер 440100000002000562, площадью 4,8205 га (назначение – обслуживание зданий и сооружений главного производственного корпуса) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г;<br>- кадастровый номер 440100000002006864, площадью 0,0078 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста); кадастровый номер 440100000002006865, площадью 0,0016 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста); кадастровый номер 440100000002006866, площадью 0,0014 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста); кадастровый номер 440100000002006867, площадью 0,0073 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; |
| **Начальная цена продажи** | 19 660 496 381 (девятнадцать миллионов шестьсот шестьдесят миллионов четыреста девяносто шесть тысяч триста восемьдесят один) белорусский рубль без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 983 024 819 (девятьсот восемьдесят три миллиона двадцать четыре тысячи восемьсот девятнадцать) белорусских рублей |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | **РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64** |
| **Организатор торгов** | **Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34** |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017<br>в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 27 апреля 2016 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 24.07.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 21 апреля 2016 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». http://grodnoino.by/**

*Друкуецца ў «Маладосці»*



**Аўтар гістарычных твораў Уладзімір Мажылоўскі прапануе гэтым разам дэтэктыў. Дзеянне ў ім адбываецца не ў даўно мінулыя стагоддзі, а ў наш час. Ну, амаль што.**

**Уладзімір МАЖЫЛОЎСКІ**

# У ЦЕНІ КРЫЖА

*Урывак*

...Я стаяў каля сваёй расчыненай паштовай скрынкі і са здзіўленнем, нават з невялікім унутраным пачуццём страху глядзеў на два канверты, якія белымі прамавугольнікамі сіратліва бялелі на яе дне. Канверты былі самымі звычайнымі. Адзін, як я адразу зразумеў, — ад маці, другі, без зваротнага адраса, але надпісаны рэзкім размашыстым почыркам, — ад майго сябра Сашкі. У іх не было нічога незвычайнага, а тым больш — страшнага, і здзівілі мяне зусім не яны. Здзівіла прароцтва майго калегі, зробленае ўсяго некалькі гадзін таму.

***

Верабей спачатку адзін раз, потым другі ўдарыўся ў шыбу акна, каля якога стаяў мой рабочы стол. Я пасмяяўся, што хітрая птушка так збірае мух, а Уладзімір Іванавіч на поўным сур'ёзе прачытаў мне невялічкую лекцыю пра нашу няўважлівасць да знакаў, якія падае нам прырода.

— Ты хочаш сказаць — Бог? — я не паверыў ніводнаму слову сябра, бо, як і многія ў нашай школе, лічыў яго дзіваком. Разумным, начытаным, інтэлігентным чалавекам, але ўсё ж такі крыху не такім, як іншыя.

— Я сказаў тое, што хацеў сказаць. Падзеі, звязаныя з развіццём цывілізацыі, і знакі, якія падае нам прырода, вельмі моцна пераплецены паміж сабой. Гэты свет сімвалічны. Ён поўны розных знакаў, падказак, сімвалаў, указанняў, як нам трэба жыць, што рабіць дазволена, а што лепш не чапаць, бо ляжыць пад смяротным для ўсяго чалавецтва кляймом забароны. Нават тыя ж літары...

— Пра літары ты мне ўжо расказваў, — не вельмі ветліва перапыніў я Валодзю. — Ты мне лепш патлумач, якая сувязь існуе паміж мной і галодным вераб'ём?

— Паміж табой і вераб'ём — аніякай. Аднак праз вераб'я прырода падае табе знак, што ты сягоння атрымаеш ліст, які даўно і з нецярпеннем чакаеш.

— Верабей два разы ўдарыўся ў шкло.

— Значыцца, ты атрымаеш два лісты, — не вельмі ўпэўнена паціснуў плячыма сябар і, крыху падумаўшы, дадаў: — І нешта мне падказвае, што адзін з іх будзе для цябе... — ён на імгненне задумаўся, пацёр сваё пераносце. — Нейкім загадкавым, незразумелым...

І вось цяпер, стоячы каля скрыні, я з унутранай шчымлівасцю ўспамінаў нядаўнюю гутарку ў настаўніцкай. «А можа, гэта проста жарт ці розыгрыш? — не здаваўся мой розум, імкнучыся па-свойму патлумачыць словы Валодзі. — Можа, ён выпадкова бачыў, як паштальён укінуў у скрынку два канверты і вырашыў скарыстацца гэтым, здзівіць, пацвердзіць свае разважанні аб сімвалізме свету?» Я ахвотна пагадзіўся са сваёй апошняй думкай і ўжо з лагоднай усмешкай на твары ўзяў лісты, зачыніў скрынку і накіраваўся да сваёй кватэры.

***

Першым я распячатаў канверт ад маці.

«Дарагі сыночак Віця!

Ты выбачай, што мы з бацькам так рэдка адказваем на твае лісты — сам ведаеш, колькі працы ў вёсцы вясной і летам. Аднак мы не гаруем, жывём добра, весела, за што кожны дзень дзякуем нашай савецкай уладзе і асабіста таварышу Хрушчову Мікіту Сяргеевічу. Праўда, амаль увесь май твой бацька правёў у Дубровенскай бальніцы, дзе дактары выцягвалі з яго аскепкі, якія ён у якасці трафеяў прывёз з-пад Кёнігсберга. Яны пачалі выходзіць з яго цела менавіта цяпер, у самы разгар работ. Але нічога, мы справіліся: з Божай дапамогай і бацьку падлячылі, і агародчык дагледзелі.

Навін у нас нямнога, а самая галоўная і самая страшная з іх — гэта раптоўная смерць твайго сябра Сашкі. Знайшлі яго забітым тры дні таму, аднак хто забіў яго і за што — невядома. Многія з нас напалоханы яго смерцю, многія здзіўлены. Адны кажуць, што бандыты шукалі ў Сашы нейкія каштоўнасці, бо ў яго хаце ўсё перавярнулі дагары нагамі, парэзалі на шматкі коўдру, падушкі, паразрывалі кнігі, паразбівалі посуд, паламалі мэблю. Другія б'юць сябе ў грудзі і ледзьве не кленуцца, што Сашка быў важаком банды Пікавага Валета і што забілі яго свае; быццам бы ён не хацеў з імі сумленна дзяліцца нарабаваным, а самае каштоўнае хаваў недзе ў лесе. Аднак большасць вяскоўцаў маўчыць, чакае вынікаў расследавання.

Следчы заходзіў і да нас, пытаўся пра цябе, цікавіўся, ці прыедзеш ты сюды на летнія канікулы. Мы адказалі, што не ведаем, і ён ад нас адчапіўся.

Ну вось, здаецца, і ўсё.

Перадавай ад нас паклоны Тані і свату.

Пішы, калі прыедзеце ў госці. Мы вас чакаем.

Да пабачэння. Твая маці.

15 чэрвеня 1962 года.»

***

Кароткі лаканічны ліст, аднак, добра ведаючы вясковае жыццё, я бачыў паміж яго радкоў тое, што сапраўды мне хацела сказаць маці: жыццё іх мяжуе са смерцю; недалечаны бацька разам з мужыкамі косіць для саўгасных кароў сена, а маці з іншымі жанчынамі і падлеткамі яго сушыць і вечарам звозіць у саўгасную пуню. І такая праца — з ранку і да позняга вечара, а ноччу іх чакае яшчэ свой агародчык, бо за працадні амаль нічога не налічваюць, а жыць жа неяк трэба! Таму маці не проста запрашае мяне з жонкай у госці, а просіць, слёзна ўмаляе: сынок, прыедзь, дапамажы нам, дай хоць крыху аддыхацца!

А пра смерць Сашкі напісана прама, без усялякіх іншасказанняў і намёкаў, і самае непрыемнае, што балюча кальнула маё сэрца, — гэта словы пра тое, што яго смерць лічаць прадказальнай і нават справядлівай. Гэтая няўдзячнасць, гэтая абыякавасць кладіся абразай не толькі на памяць пра майго сябра. Яны чарнілі і маіх землякоў, і маіх родных, і мяне асабіста.

***

Ну які з Сашкі бандыт? Высокі, худы бы жэрдка, слабы і няскладны, ён толькі ў нечым хворым уяўленні мог быць крыважэрным і бязлітасным Пікавым Валетам, пра якога мне яшчэ зімой пісала маці. Мой жа сябар быў добрым, шчырым і негаваркім хлопцам. Ён любіў дзяцей, самааддана любіў сваю працу і як настаўнік гісторыі летам са сваімі вучнямі пастаянна корпаўся на руінах мясцовага касцёла ці панскага палаца, даглядаў тое, што яшчэ засталося ў вёсцы ад панскага парку. Ён пастаянна быў у руху, увесь час нешта раскопваў, пра нешта распытваў старажылаў, нешта запісваў у свой тоўсты нататнік, які, дарэчы, я падарыў яму на трыццацігоддзе. Ён жыў мінулым.

Многія не давяралі яму, лічылі, што ён з імі няшчыры, што ён хітруе, што ён насамрэч шукае нейкі скарб і зносіцца з нячыстымі сіламі, і абыходзілі майго сябра бокам, каб толькі быць падалей ад граху.

«Эх, Сашка, Сашка! — я ніяк не мог паверыць у яго смерць. — Што ўжо ты там адкапаў такое, што каштавала табе жыцця?» У надзеі знайсці адказ на гэтае пытанне і адначасова баючыся гэтага, я распячатаў другі канверт...

**Анастасіі Падрабінкінай 15 гадоў. Яна вучыцца ў ліцэі №1 Магілёва. Неяк паўдзельнічала ў гарадскім конкурсе юных пісьменнікаў — і стала яго лаўрэатам. Твор з намінацыі «Пра каханне» трапіў у рэдакцыю часопіса «Маладосць», а адтуль — на старонку «Чырвонкі. Чырвонай змены».**



**Анастасія ПАДРАБІНКІНА**

# ПРА КАХАННЕ

*Урывак*

СВІТАЛА... У роснай духмянасці красавіцкай раніцы раставаў пунсовы золак. Звонкі дзіцячы голас зліваўся з вясёлым шчабятаннем птушак:

— Мама, мама! У нас на двары — новая яблынька...

Хмурая жанчына выйшла на ганак і ўсміхнулася дачцэ. Матчына сэрца хвалявала здольнасць маленькай Сашачкі радавацца першым пацалункам сонца, пакінутым на сырой зямлі, — дзіўная здольнасць, дараваная нябёсамі толькі дзецям ды паэтам. Жанчына разгладзіла старэнькі фартух і, лёгка падхапіўшы вялікія бліскучыя вёдры, накіравалася да калодзежа.

КАЦЯРЫНУ (так звалі жанчыну) выдалі замуж рана — ёй ледзь мінула сямнаццаць. Наўрад ці яна магла сама адказаць дакладна, ці кахала свайго мужа, каваля Сяргея, з вечна здзіўленымі, колеру стальнога неба вачыма. Не паспела пажыць, як той загінуў, кінуўшыся ў вір за родным братам. Так і не выплылі абодва, захлынуўшыся цёмнымі водамі... Хавалі Сяргея, калі ў паветры млява кружылася маладое лісце. Здзіўлена каркалі вароны. У пацямнелай царкве тужліва гудзеў іржавы звон. З сумам, які бязлітасна раздзіраў сэрца, Кацярына прыціскала да сябе паўгадовую дачку.

У адзін з тых дзён, калі п'янлівай смугой апускаўся туман і падавалася, нібы паветра напоўнена мігатлівым святлом, Кацярына выйшла на ганак і мімаволі залюбавалася дачкою. Яе Сашачка сустракала сваю шаснаццатую вясну... О, вочы маці, што глядзіць на сваё дзіця! Якім святым нябесным агнём вы гарыце, якое ласкавае святло выпраменьваеце! І тое, што недагавораць вусны, абавязкова адлюструецца ў матчыных вачах.

Калі Кацярына схавалася за старэнькімі веснічкамі, з-за драўлянай адрыны, дзе стаялі кошыкі, што рассохліся за зіму, паказалася Сашачка. Усе фарбы ранішняга золку ззялі на яе румяным тварыку, рудаватыя валасы былі тугім вузлом скручаны на патыліцы, а некалькі асабліва непаслухмяных пасмачак выбіваліся з-пад светленькай хусцінкі, расшытай каляровымі ніткамі. Дзяўчына прабіралася да густога саду і смяялася звонка і пяшчотна. Яе цёмна-шэрыя, як у бацькі, вочы са здзіўленнем прыпыняліся то на танюткай галінцы, то на птушцы-шчабятусе...

РАПТАМ Саша знерухомела. Пад галлём любімай з дзяцінства яблыні сядзеў незнаёмец і штосьці пісаў. У яго ранцы была відаць кніга, абгорнутая паперай. Галінка хруснула і не дала дзяўчыне застацца незаўважанай: чалавек адарваўся ад справы і адкінуў назад раскудлачаныя кудзеркі колеру падмоклага жыта... Падавалася, што разам з Сашай застыла прырода: у кудзеркавым голлі перастаў гарэзіць вятрыска, супакоіліся пчолы, што гудзелі без стомы, сцішылася першая пяшчотная лістота. Быццам само жыццё баялася скалыхнуць два замерлыя адно для аднаго сэрцы...

А потым Сашка штодня, без выхадных і свят, зазірала ў бібліятэку да Мацвея, які там працаваў, — таго самага незнаёмца, сустрэтага ёй мінулай вясной пад яблыняй, што распускалася пяшчотай. Сёння Сашачка была асабліва рада: Мацвей абяцаў звазіць яе на кірмаш у горад! Канешне, было нялёгка ўгаварыць маці, але чаго ж ёй хвалявацца? Мацвей жа кахае Сашу! А колькі новых кніг яна ад яго атрымала, а што за словы ён ёй казаў! І якім чароўным бляскам гараць яго вочы кожны раз, калі ён прамаўляе запаветнае «кахаю»...

Саша атрымала ў спадчыну ад маці рысу, уласцівую натурам простым і чулым: яна аддавалася пачуццям без надуманай сарамлівасці, не адчуваючы на сабе цяжару забабонаў. Канешне, яе не маглі не хваляваць размовы, якія хадзілі па іх малюсенькай вёсцы. Аднойчы дзяўчына ўбірала косы стужкамі і да наіўнасці кранальна шчабятала суседцы Дашы пра Мацвеева каханне. «Кахаць, здаецца, ён кахае... — з'едліва сказала суседка, — а замуж?»

...МАЦВЕЙ адклаў убок том Вальтэра Скота, задумліва зірнуў у акно і адразу ж усміхнуўся: яблыневы цвет, які біў у шкло сваёй пяшчотай, нагадаў яму Сашачку. Лёгкім трапятаннем адгукнулася сэрца. Ён моцна кахае яе... Але дагэтуль баіцца сказаць тое, што, здавалася б, вось-вось павінна вырвацца з самых глыбіняў маладога сэрца, усё ніяк не можа вымавіць гэтыя запаветныя словы: «Станеш маёй жонкай?»

Мацвей уздыхнуў. Успомніліся любімыя вочы. Колькі б ён аддаў, каб тануць у іх кожную раніцу! «Усё, заўтра скажу. Вырашана, заўтра!»

Кацярыну разбудзіла ў тую ноч дзіўнае пачуццё. У сне, неспакойным і трывожным, яна бачыла нябожчыка-мужа, які бег кудысьці ў лес з маленькай Сашачкай на руках. Над імі, разрываючы дзікім карканнем паветра, кружляла змрочнае варанне. Бацька з малюткай ужо былі блізкія да выратавальнага гушчару, калі невядомая сіла скалыхнула зямлю і ўсё згасла... Кацярына не была прымхлівай, але ўсё ж такі задрыжала ад невыразнага прадчування. Так і праварочалася да раніцы, апавітая, быццам тугімі цёмнымі стужкамі, глухой начной цішай.

А НАСТУПНЫМ чэрвеньскім днём здарылася страшнае. Уся вёска сабралася каля рэпрадуктара, перагаворвалася, перакрыквалася, здзіўлялася. З шэрай скрыні данёсся суровы голас, і за адну секунду ўсталявалася змрочная цішыня. У Кацярыны паплыло перад вачыма...

Дваццаць трэцяга чэрвеня прыйшоў загад аб мабілізацыі ў Чырвоную Армію. Неўзабаве на світанні, зірнуўшы апошні раз на збляклую яблыню, сышоў Мацвей. Напярэдадні ён абяцаў дзяўчыне: «Вось пабачыш, прыйду да цябе праз месяц!» Але Саша толькі сумна глядзела перад сабой, трымаючы яго за руку...

Праз чатыры месяцы немцы занялі іх вёсачку. Падчас зацяжных абстрэлаў у дрэва патрапілі кулі, і яблыня залілася бурштынавымі слязьмі. Разам з ёю, седзячы ў сырым склепе, плачма плакала Саша, прыціскаючы да грудзей цвёрды шэранькі трохкутнік — адзіны ліст, атрыманы ёю ад Мацвея чатыры месяцы таму.

Каб не памерці з дачкой ад голаду, Кацярына хадзіла працаваць у камендантцкі дом, і Сашачка падоўгу заставалася адна ў халодным двары. Яблыня плакала цэлы месяц і болей не квітнела. Толькі цьмянела амаль празрыстае лісце, як цьмянелі Сашыны вочы, якія больш нічому не здзіўляліся...

SEX-БАЛЯСЫ

# ДАЦЬ ДРАЗДА

**Вы адчуваеце, шаноўнае спадарства, як у паветры выразна запахла вясной, якую ўсе мы так стаміліся чакаць? Хоць, як той казаў, яшчэ нават першыя дзявочыя каленкі не пачалі сарамліва прабівацца з-пад кароценькіх спаднічак. Але ж вясна — гэта не абавязкова сонейка, цяпло і аголеныя дзявочыя ножкі, але і звязаныя з ёй акалічнасці. Таксама веснавыя, якія менавіта ў гэты час і абвастраюцца... Іх прадчуванне з'явілася, калі за акном яшчэ ляталі «белыя мухі». Памятаеце, як у класіка: «Жди, когда снега метут...»? І дачакаліся. Тут раптоўна — ужо як у другога не менш знакамітага творцы — «Нынче вырвалась, будто из плена весна...» А праз нейкі час ужо ад сябе захацелася дадаць: заўважыў я — іх было двое.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Хто першы, вы, мабыць, ужо здагадаліся. Прадстаўнік ад нашай краіны на «Еўрабачанні». Але калі раней у такіх выпадках абмяркоўвалі правільнасць-няправільнасць выбару, спрачаліся наконт вартасцяў песні і касцюма выканаўцы, ды гэтым разам усё выйшла нашмат прасцей. Пакуль размоў — толькі пра касцюм. Дакладней, пра адсутнасць прысутнасці. Заяўлена, што спявак выйдзе на сцэну аголеным ды нешта ў кампаніі ваўкоў. Я, ведаеце, люблю фільмы пра немцаў і ваўкоў, а тут капут якое «кіно» для дарослых атрымліваецца!.. Паглядзім, што будзе...

Другім стаў лідар папулярнай музычнай групы, які зладзіў у падтрымку прадстаўніка на «Еўрабачанне» фотасесію ў чым маці нарадзіла і сярод гусей. Апошнія, па задуме аўтараў здымак, сімвалізуюць айчынны аграсектар. Чаму менавіта яны асацыіруюцца ў іх з сельскай гаспадаркай, засталося загадкай. («Людзі, як вам не сорамна?! Не называйце Кіркорава Філем! Мільёны паклоннікаў любяць гэтага артыста! Таленавітага, разумнага, добрага, па-сапраўднаму інтэлігентнага сабаку з перадачы «Добрай ночы, малыя».) Хаця я абсалютна нічога не маю супраць гэтай любімай сэрцу і страўніку Міхаіла Самуэлевіча Панікоўскага птушкі. А любімы сын лейтэнанта Шміта, як памятаеце, разбіраўся ў пытанні. Ды што вялікі сляпы? Гусі, ведаем усе, некалі Рым выратавалі. Былі яны на вышыні і зараз — у прамым сэнсе слоў — і прыкрылі лідару групы тое, што ў футболе падчас прабіцця штрафнога гульцы рукамі спрабуюць абараніць.

**У імя чаго адбываюцца ўсе гэтыя рэчы? Зразумела, дзеля піяру. Ці гаворачы словамі з песні, «чтоб рифмами наполнить мир, в котором я живу...»**

Дык каб толькі справа абмяжавалася адным цялесным стрыптызам! Я ж кажу, подых вясны, розныя абвастрэнні... Вось нядаўна лідар групы «Ленінград» заявіў аб звальненні шматгадовай салісткі. Той самай, якая выканала суперхіт апошняга часу — «Лабутэны». І, дарэчы, забараніў спявачцы выконваць гэтую песню. Прычына звальнення? «Мы з багінямі не прызвычаіліся працаваць, мы проста гаршкі абпальваем». Як вам такое тлумачэнне? Але ж гэта Шнур — што з яго ўзяць? («Як вярнуць давер дзяўчыны, калі стралялі ў яе з траўмата?») Сітуацыяй не прамінуў скарыстацца аматар гусей: запрасіў салістку ў свой калектыў. («Правільна выбіраць не малое зло, а таннае».) Але ж гэта не адзінкавы выпадак, звязаны з веснавымі праявамі.

У Гродне нядаўна адзін малады чалавек правёў па цэнтры горада сваю жонку... закаваную ў наручнікі. А потым прымусіў яе скокнуць з моста на «тарзанцы». Гэта, як высветлілася потым, ён такім чынам вырашыў зрабіць падарунак каханай на дзень нараджэння. («Адносіны — гэта не толькі радасць, гэта яшчэ і вялікая адказнасць. Часам нават прычыняюць боль» — «Ты мяне таму нажом кальнула?» — «Не перабівай!»)

Ці вось навіны ад суседзяў. Адзін расійскі спявак і музыкант заявіў, што 80 працэнтаў таго, што выконвала група Led Zeppelin, немагчыма слухаць, а Rolling Stones увогуле не ўмеюць іграць і спяваць. У сеціве тут жа з'явіліся фотажабы: «ролінгі» з павагай трымаюць у руках пласцінку нашага прамоўцы; на грудзях аголенага па торс Міка Джагера набіта тату — твар таго ж музыкі і чатырохрадкоўе з фактычна адзінай шырока вядомай песні апошняга пад назвай «Плыт». Дарэчы, я змог прыгадаць яшчэ адзін яго твор. Там ёсць такія словы: «Девочка сегодня в баре, девочке пятнадцать лет...» Далей пра тое, што «ў сняданкі за ўвесь тыдзень, нягледзячы на забароны, змясціліся два кактэйлі і паўпачка цыгарэт...» Ва ўмовах колішняй суровай маралі выкананне гэтай песні прыраўноўвалася ледзьве не да распаўсюджвання парнаграфіі (пагугліце, калі хочаце, увесь тэкст). Таму яна не гучала па радыё, на канцэртах, а толькі перадавалася з рук у рукі на магнітафонных бабінах. На гэтым фоне выказванне гэтага чалавека пра тое, што 80 працэнтаў твораў Моцарта — самапаўтор, гучыць неяк дзіўнавата. Як жартавала каманда КВЗ «Фізтэх» з Далгапрудната: «Калібруйце базар!»

У замежжы сітуацыя не лепшая. У ЗША тэлезорка і вядомая мадэль зрабілі сумеснае сэлфі топлес і выклалі фота ў інстаграм. Першая пажартавала, маўляў, апрануць няма чаго, другая «завярнула» нешта «філасофскае» кшталту «мы больш, чым проста целы, але гэта не азначае, што мы павінны саромецца іх ці нашай сексуальнасці». Пры гэтым на здымку дзвы трымаюць сярэдні палец у вядомым палажэнні. («Я дурніца не спецыяльна. Я баба. Гэта мае заводскія настройкі».)

У імя чаго адбываюцца ўсе гэтыя рэчы? («У Сярэднявеччы людзі не баяліся рабіць адно аднаму зло. Зямля ж была не круглая!») Зразумела, дзеля піяру. Ці гаворачы словамі з песні, «чтоб рифмами наполнить мир, в котором я живу...»

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Вініл — гэта нешта сакральнае»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— Значыць, вы за традыцыю?***

— Гэта як італьянская музыка ў оперы — неад'емная частка мастацтва. Цяпер рок-музыка і метал — ужо амаль гісторыя. Сёння музыка не адыгрывае такой ролі, якую яна мела ў 1970-я, 80-я, нават у 90-я. Мы бачым, як сыходзяць апошнія тытаны музыкі і разумеем: больш такога не будзе. Эпоха сыходзіць. Ад гэтых персон шмат што залежала. Гэта частка гісторыі, якую мы сёння, на жаль, можам толькі капіраваць. Амаль усе сучасныя гурты такім капіраваннем і займаюцца: імкнуцца гучаць, як музыканты 60-х, 70-х, 80-х. Але гэта толькі «гістарычная рэканструкцыя». Не будзе больш Rolling Stones, Motorhead не таму, што іграць так не могуць, а таму што час мінуў.

**«Я магу сабраць залу, адыграць канцэрт, але гэта бывае не так часта. Прыхільнікі ж бачаць ува мне чалавека, які на гэта здольны штодзённа, штогадзінна. Мяне палохае, што я не той супермен, якога яны чакалі ўбачыць».**

***— А як ставіцеся, калі музыку Gods Tower пераймаюць маладыя гурты?***

— Добра. Хай пераймаюць. Але ж так, як мы, яны не сыграюць.

***— Яны звяртаюцца да вас па парады, з просьбамі паслухаць іх музыку і ацаніць?***

— Так, бывае. Але цяпер усе разумеюць, што гэта не прыносіць ніякай карысці. «Кумаўство» ў музыцы не працуе. Я магу паслухаць, сказаць: грайце далей. Калі звяртаюцца, пішу, што падабаецца, а што не. Магу напісаць і трохі груба. Дзякуй богу, дасылаюць больш-менш слухабельны матэрыял, таму такое бывае досыць рэдка.

***— Якія з маладых беларускіх гуртоў вы б адзначылі?***

— Маладосць для гурта — адносная катэгорыя. Напрыклад, Folcore — калектыў малады, але музыкі, якія ў ім граюць, ужо досыць вопытныя. Ды і іншыя гурты, якія я магу выдзеліць, не зусім маладыя — Irdorath, «Сярэбранае вяселле». Мне здаецца, што апошнім часам не было сенсацый у музыцы, я не бачыў абсалютна новага матэрыялу, які ўразіў бы на ўсе сто працэнтаў. На жаль, у нас ёсць такі трэнд: людзі арыентуюцца адзін на аднаго, і часта гэта перашкаджае зрабіць сапраўды годны прадукт.

***— Вас на вуліцах пазнаюць, просяць аўтографы, сфатаграфавацца?***

— Я ж не Саладуха, таму гэта бывае нячаста. Найчасцей пазнаюць, калі з'яўляюся на канцэртах. Нядаўна было ўручэнне музычнай прэміі. Планаваў атрымаць узнагароду — і адразу ўцячы дадому, да дзяцей. Але не атрымалася. Я не настолькі медыйная фігура, ды і наш гурт можна назваць, хутчэй, андэграўндным. Для мяне нават з'яўіцца на старонках маладзёжнага дадатку «Звязды» — незвычайна.

***— Вы гадуеце двух сыноў. Як яны ставяцца да таго, што іх тата — рок-зорка?***

— Я ніколі не акцэнтаваў увагу на гэтым. Да маёй творчасці ў сям'і ставяцца спакойна. Учора разам з сынамі ехалі па горадзе, пабачылі афішу нашага канцэрта. Яны кажуць: «Тата — гэта ты!» Я кажу: так. І паехалі далей. Я цалкам адмаўляю культ асобы. Калі чалавек робіць добрыя ўчынкі, ён павінен іх рабіць або заўжды, або ніколі. Лепш зрабіць што-небудзь карыснае, чым проста расказваць пра гэта.

***— Што ў планах Gods Tower?***

— Дарабіць альбом, запісаць яго хоць бы часткамі. Плануем таксама адыграць некалькі канцэртаў і закончыць працу над DVD.

***— Здаецца, гурт Gods Tower ужо мае настолькі багатую гісторыю, што цэлую кнігу пра яго можна напісаць і выдаць прыгожым альбомам з фотаздымкамі...***

— Мне ўжо шмат разоў гэта прапаноўвалі. Да задумкі стаўлюся вельмі холадна. На такую працу трэба шмат часу, а карысці ад яе я не бачу. Напрыклад, гітарыст легендарнага гурта The Sweet, на музыцы якога я вырас, напісаў такую кнігу. Але яна не стала бестселерам. Кніга ёсць, яе можна пачытаць. Але лепш бы ён замест кнігі напісаў некалькі новых песень. Пісаць кнігу пра гурт — гэта сізіфава праца. Ёсць шмат іншых сфер, дзе можна прыкласці свае намаганні. Думаецца, такую працу лепш рабіць у фармаце блога: калі ёсць вольная хвілінка, магу напісаць, што Gods Tower рабіў некалькі гадоў таму, пытайцеся, і я напішу больш.

***— Які з перыядаў існавання гурта вы назвалі б сапраўды паспяховым, яго «залатым часам»?***



— Наш «залаты час» не быў паспяховым — ён быў выбуховым. Там былі як поспехі, хуткі рост, так і... ніякіх вынікаў. Насамрэч у нас цяпер таксама вельмі добры час, збалансаваны. Ад гурта асабліва сенсацыйнага ніхто не чакае, проста робім тое, што прыходзіць у галаву. Прыдумалі — зрабілі. А калі не зрабілі, то ніхто не пакрыўдзіцца. Калі выбіраць паміж выбуховым часам і збалансаваным, то зараз, напэўна, лепш. Хоць тады было жывей.

***— Чым займаецеся, акрамя музыкі, працы ў World of Warplanes?***

— Шмат часу праводжу з сям'ёй, катом, гляджу дакументальныя фільмы, чытаю кнігі па археалогіі, антрапалогіі, пра каланізацыю Аляскі ці аэрапланы часоў Першай сусветнай вайны. Калі звяртаюся да мастацкай літаратуры, то для адпачынку выбіраю досыць лёгкія жанры — фантастыку ці фэнтэзі. Люблю глядзець кіно, асабліва нізкабюджэтнае, ці пара-кіно. Маю мару: навучыцца кіраваць аўтамабілем. Але разумею, што нават калі навучуся, машыны сваёй у мяне не будзе.

**«Сёння музыка не адыгрывае такой ролі, якую яна мела ў 1970-я, 80-я, нават у 90-я. Мы бачым, як сыходзяць апошнія тытаны музыкі і разумеем: больш такога не будзе».**

***— А як ставіцеся да сваіх прыхільнікаў? Пасля канцэртаў любіце фатаграфавацца, раздаваць аўтографы, гутарыць з фанатамі?***

— Так, я люблю сваіх фанатаў. Інакш навошта ўсё рабіць, выходзіць на сцэну. Але бывае, што я іх проста баюся. Адчуваю псіхалагічны дыскамфорт, калі да мяне падыходзіць чалавек, апрануты значна лепш за мяне, і пачынае расказваць, які я круты. Дакладна такое ж адчуванне, калі да мяне падыходзяць прыгожыя дзяўчаты і пачынаюць расказваць пра Gods Tower. Я магу сабраць залу, адыграць канцэрт, але гэта бывае не так часта, некалькі разоў на год. Прыхільнікі ж бачаць ува мне чалавека, які на гэта здольны штодзённа, штогадзінна. Мяне палохае, што я не той супермен, якога яны чакалі ўбачыць. Думаю, што менавіта праз страх неадпаведнасці ролям і ўяўленням рэчаіснасці некаторыя музыканты не любяць гутарыць з прыхільнікамі. У мяне таксама такое бывала, але думаю, што я пазбавіўся ад гэтага. Стараюся ставіцца да сваіх прыхільнікаў з павагай, якую яны, безумоўна, заслужылі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**

*vesialuha@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.012.
Нумар падпісаны ў 19.30 06.04.2016 г.

■ Мы і свет

# ДАЙ РУКУ, СЯБАР!

**На прынцыпах народнай дыпламатыі грунтуецца работа Беларускага таварыства дружбы**

**«Мы промні зорнай службы. Нам верыцца здаля, што стане Домам дружбы ўся зямля» — гэтыя прыгожыя словы паэта Сяргея Панізніка, пакладзеныя на музыку Эдуарда Зарыцкага, гучаць у гасцінным Доме дружбы ў беларускай сталіцы на пачатку кожнай імпрэзы. Гэтымі радкамі з гімна можна акрэсліць і мэты працы Беларускага таварыства дружбы народаў і культурнай сувязі з замежнымі краінамі — грамадскай арганізацыі, якая «кватаруе» ў гэтым знакавым будынку. Сёння таварыства — другая па ўзросце пасля Чырвонага Крыжа грамадская арганізацыя Беларусі — адзначае сваё 90-годдзе.**

**Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася са старшынёй прэзідыума Беларускага таварыства дружбы Нінай ІВАНОВАЙ і распытала пра асноўныя мэты працы арганізацыі, яе старых і новых сяброў, а таксама даведалася пра міжнародныя праекты, якія пакуль чакаюць сваёй рэалізацыі.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## Ад класікаў пачатак

— Мы заўсёды з гонарам падкрэсліваем, што Таварыства культурных сувязяў было ўтворана па ініцыятыве вядомых літаратараў — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Міхася Чарота, Цішкі Гартнага і іншых. Мэтай арганізацыі ад пачатку была вызначана папулярызацыя беларускай культуры, беларусказнаўства, традыцый нашага народа за межамі краіны і, адпаведна, папулярызацыя духоўных здабыткаў іншых народаў у Беларусі. Выключэннем сталі толькі часы Вялікай Айчыннай вайны, калі таварыства не працавала. Мяне асабіста ўражвае тое, што нашымі папярэднікамі былі людзі, чые імёны «звіняць», — выдатныя творцы ў музыцы, літаратуры, мастацтве, тэатры: Ларыса Александроўская, Стэфанія Станюта, Рыгор Шырма, Генадзь Цітовіч, Уладзімір Алоўнікаў, Андрэй Макаёнак, Іван Мележ, Анатоль Анікейчык, Максім Танк, Васіль Быкаў... і пералік можна доўжыць. Старшынямі таварыства ў свой час працавалі пісьменнікі, якіх ведаюць не толькі ў Беларусі, але і далёка за межамі нашай краіны.

Праз нашу арганізацыю свет пазнаў беларускую культуру: менавіта па камандзіраванні таварыства дружбы з канцэртамі за мяжу выязджалі творчыя калектывы, якія сёння лічацца карыфеямі ў сваім жанры: Дзяржаўны ансамбль танца, «Купалінка», «Харошкі», «Крыжачок» і многія іншыя. Лёс гэтых калектываў склаўся вельмі добра, і мы часам жартуем, што наша таварыства адыграла выключную ролю ў іх жыцці.

## Сябры і партнёры

— Ганарымся тым, што і сёння ў нашай арганізацыі працуюць сапраўдныя рыцары народнай дыпламатыі — аўтарытэтныя, шматгранныя, высокай культуры людзі. Яны задзейнічаны ў розных структурах: сёння ў складзе таварыства дружбы 40 суполак, якія наладжваюць сяброўскія стасункі з рознымі замежнымі краінамі; дзясяткі партнёраў за межамі краіны, што садзейнічаюць папулярызацыі там беларускай культуры. У працы нашага таварыства можна вылучыць чатыры асноўныя праграмы. Культура — самая першая і важная, традыцыйная. Маем праграму міжнароднага рэгіянальнага супрацоўніцтва (яе мэта — парадненне гарадоў), а таксама гуманітарную і маладзёжную праграмы.

З некаторымі замежнымі партнёрамі шмат гадоў дапамагаем раёнам, якія пацярпелі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Напрыклад, з фондам «Дзецям Чарнобыля» зямлі Ніжняя Саксонія (Германія) 20 гадоў супрацоўнічаем па пастаўцы апаратаў ультрагукавой дыягностыкі ў медыцынскія ўстановы Беларусі, павышэнні кваліфікацыі медыкаў. За гэты час у нашу краіну перададзена звыш 200 апаратаў. Зараз мы рыхтуемся да дзён беларускай культуры ў Ніжняй Саксоніі — неўзабаве балетная трупа Музычнага тэатра выязджае на гастролі. Іх канцэрты пройдуць у дзевяці гарадах зямлі.

## Работа на імідж

— Ёсць людзі, якія працуюць за грошы; ёсць асобы, якія прагнуць славы. Але ў нашым таварыстве людзі працуюць на імідж краіны, на тое, каб яшчэ вышэй узняць годнасць беларусаў. Усе яны маюць асноўную працу, сем'і, іншыя клопаты, тым не менш у нас у таварыстве за сімвалічную падзяку яны шчыруюць так, нібыта атрымліваюць вялікі заробак.

Напрыклад, таварыства «Беларусь — Швейцарыя» ўзначальвае акадэмік, знаны мастак Георгій Паплаўскі; Сяргей Панізнік, вядомы паэт, перакладчык, журналіст, шмат гадоў кіруе таварыствам «Беларусь — Латвія». З намі працуе і міністр культуры Барыс Святлоў: ён стаў старшынёй таварыства «Беларусь — Вялікабрытанія», яшчэ калі быў рэктарам БДУКіМ, але і атрымаўшы прызначэнне на пасаду міністра, наша таварыства не пакінуў. А старшыня праўлення Пріорбанка Сяргей Касцючэнка актыўна працуе ў таварыстве «Беларусь — Аўстрыя», ажыццяўляе значныя і маштабныя праекты. Таварыства «Беларусь — Польшча» ўзначальвае пісьменнік, гісторык Анатоль Бутэвіч — ён на сваіх імпрэзах абавязкова падкрэслівае супольную мінуўшчыну нашых краін. Дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ Віктар Шадурскі кіруе таварыствам «Беларусь — Францыя» і праводзіць вялікую работу сярод моладзі.

Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі ўзначальвае таварыства «Беларусь — Украіна». Вельмі прыемна, што з намі працуе сын Якуба Коласа Міхась Міцкевіч, мы ганарымся гэтай пераемнасцю пакаленняў, зацікаўленасцю. Сын класіка, пачынальніка нашай літаратуры ўзначальвае таварыства «Беларусь — Ірландыя», ладзіць прыгожыя і незвычайныя святы для моладзі. Вядомы драматург Аляксей Дудараў працуе ў кірунку наладжвання сяброўскіх стасункаў з Літвой. Анатоль Талкачоў, галоўны ўрач Мінскага дыягнастычнага цэнтра, кіруе таварыствам «Беларусь — Куба». Прафесар Іван Чарота ўзначальвае таварыства «Беларусь — Сербія», дырэктар радыёстанцыі «Беларусь» паэт Навум Гальпяровіч актыўна працуе ў галіне наладжвання дыялогу Беларусі з Арменіяй. Цяжка сёння ўявіць сабе Дом дружбы без грунтоўнага, таленавітага, эмацыянальнага Міколы Мятліцкага — паэта, старшыні таварыства «Беларусь — Славакія».

Адметна, што і «ветэраны» нашага таварыства сёння актыўна працуюць. Дагэтуль на імпрэзах бывае і дапамагае іх рыхтаваць былы намеснік старшыні прэзідыума Беларускага таварыства дружбы Ніна Нерад. Сёння яна на пенсіі, але цікавіцца нашай працай. Дапамагае і старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп.

## Ад грамадскіх ініцыятыў — да дзяржаўных праграм

— Мы вельмі ганарымся тым, што дзяржаўныя дзеячы, якія прыязджаюць у Беларусь з краін-партнёраў, не прамінаюць сваёй увагай Беларускае таварыства дружбы.

Цесна і плённа супрацоўнічаем з Міністэрствам замежных спраў Беларусі, адчуваем яго моцную падтрымку. Вельмі прыемна, што ў многіх выпадках інтарэсы таварыства пераплятаюцца з дзяржаўнымі праграмамі і наша дзейнасць прыносіць карысць на дзяржаўным узроўні. Больш за тое, я лічу, што любая дзяржаўная справа, нават самая важная, без падтрымкі грамадскасці, грамадскіх структур непаўнавартая і звужаная. Таму нават тыя культуралагічныя мерапрыемствы, якія мы ладзім у Доме дружбы, — таксама падтрымка дзяржаўнай праграмы па фарміраванні станоўчага іміджу нашай краіны. Там, дзе ведаюць пра Беларусь, нашы станоўчыя якасці, можна чакаць зусім іншага стаўлення да ініцыятыў з нашага боку. Мы для іх ужо не чужынцы.

Наладжваць стасункі з краінамі-суседзямі досыць проста. Але і з далёкімі ў геаграфічных адносінах дзяржавамі ладзіць дыялог нескладана. Мы супрацоўнічаем з Кубай, Індыяй, Кітаем. Адзінае, што стрымлівае, — гэта адлегласць. Для арганізацыі гастроляў нашых творчых калектываў, рэалізацыі сумесных праектаў патрэбны вялікія грошы. Гэта нам не пад сілу. Тым не менш стараемся падтрымліваць кантакты хаця б віртуальна. А калі ў Беларусь прыязджае, напрыклад, кубінскі выканаўца, ён абавязкова будзе з канцэртам у Доме дружбы. Нам важна, каб ведалі, што ў Мінску ёсць такі «прытулак» для замежнікаў і разумелі, што тут цікавяцца культурай іншых народаў.

## Што ў планах?

— Задумак шмат. Пазнавальна-азнаямленчыя мерапрыемствы, «круглыя сталы», канферэнцыі, сустрэчы з нашымі партнёрскімі арганізацыямі. Але часам жыццё нібыта само прапануе новыя задачы, ідэі, ад якіх грэх адмаўляцца. Адна з такіх задумак — вялікі беларуска-аўстрыйскі культурны праект, разлічаны на два гады. Для нас справа гонару падрыхтаваць яго.

Рыхтуемся да вельмі значнай падзеі наступнага года — 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін Беларусі з рознымі краінамі. Студзень і люты 1992 года былі вельмі «ўраджайнымі» на плённыя кантакты. Тады наша маладая рэспубліка актыўна наладжвала сувязі. Такія падзеі дазваляюць звярнуць увагу на Беларусь з розных пунктаў гледжання. Гэта і культура, і міждзяржаўны, грамадскі дыялог, і перспектывы супрацоўніцтва. Вядома, у гэтым кірунку будуць вялікія дзяржаўныя праграмы, але і мы далучымся да святкавання, будзем з любоўю і павагай гаварыць пра розныя краіны, разважаць пра тое, што яшчэ можна зрабіць для ўмацавання ўзаемаадносін у розных сферах.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Навеяла...

# ШАНТРАПА СПЯВАЦЬ НЕ МОЖА

**Калі назваць чалавека «ідыётам», ён, вядома ж, пакрыўдзіцца. А за «нягодніка» альбо «паганца» і наогул у бойку кінуцца можа. Бо ўсе гэтыя словы для чалавека зняважальныя...**

Але, аказваецца, яны не заўсёды такімі былі. Больш за тое, многія з іх і наогул даволі прыстойнымі калісьці з'яўляліся.

Вось узяць, напрыклад, слова «ідыёт». У Старажытнай Грэцыі «ідыётэсамі» называлі людзей, якія не прымалі актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, не цікавіліся палітыкай і наогул вялі спакойны, размераны лад жыцця. А старажытныя грэкі з іх дэмакратычнымі традыцыямі лічылі ўсіх, хто не праяўляе інтарэсу да палітычнага і грамадскага жыцця роднага поліса, не зусім паўнавартнымі. Ідыётамі, іншым словам...

Слова «супастат» таксама мела раней даволі нейтральнае значэнне. Супастатам называлі чалавека, які проста знаходзіўся насупраць. А паколькі часцей за ўсё насупраць знаходзіўся той, з кім трэба было праводзіць паядынак (на кулаках альбо нават са зброяй у руках), то і слова «супастат» паступова ператварылася ў даволі негатыўнае.

А вось слова «мярзотнік» з самага пачатку мела не толькі негатыўнае, але і вельмі абразлівае значэнне. І на гэта былі свае прычыны.

У нашых продкаў, як і ў іншых народаў паўночных краін, цяпло лічылася чымсьці добрым, станоўчым, а вось холад, наадварот, асацыяваўся з усім кепскім і адмоўным. Вось і слова «мярзотнік» (вытворчае ад слова «мерзнуць») міжволі выклікала агіду. А таксама імкненне як мага далей быць ад такога «замарожанага» чалавека.

Слова «нягоднік» не такое старажытнае.

Нягоднікамі калісьці называлі маладых мужчын, якія не гадзіліся ў рэкруты («нягоднымі» былі для арміі). А ператварылася гэтае слова ў зняважальнае таму, што гэтых «нягоднікі», не баючыся, што ім могуць за кепскія паводзіны «лоб забрыць у салдаты», такое часам вытваралі...

А ўзяць слова «паганец». Нічога абражальнага не мела яно ў першапачатковым сваім значэнні. У Старажытным Рыме pagan — чалавек, які пражывае ў глухой сельскай мясцовасці. Потым, калі хрысціянства пачало імкліва распаўсюджвацца ў імперыі, менавіта жыхары такіх аддаленых паселішчаў доўгі час заставаліся яшчэ прыхільнікамі сваіх ранейшых багоў. Вось і сталі словам «паганы» абазначаць усіх язычнікаў. А паколькі язычнікі, на думку хрысціян, займаліся ўсялякімі паскудствамі, то слова «паганец» пачало азначаць наогул усіх нядобрых людзей.

Ды і выраз «подлы чалавек» («падлюка») першапачаткова ўказваў толькі на тое, што гэта чалавек з падатнага саслоўя. Паны, шляхцічы, духавенства не плацілі падаткі, а прадстаўнікі подлых саслоўяў (якія «пад імі былі») — плацілі. Цяпер жа, калі падаткі плоцяць усе, значэнне слова «подлы» змянілася кардынальна.

Ці ўзяць слова «прахвост». Гэта скажонае нямецкае слова «прафос». Прафосамі калісьці ў арміі называлі ваенных, якія мелі права прызначаць салдатам, што парушылі дысцыпліну, пэўныя пакаранні ў якасці выхаваўчых мер. Прафосы (прахвосты) часта злоўжывалі гэтым сваім правам, таму салдаты (і наогул ваенныя) іх ненавідзелі. Хутка назва гэтай пасады стала сінонімам такіх паняццяў, як «мярзотнік» альбо «падлюка».

Ну а слова «хам» прыйшло да нас з Бібліі. Хам — адзін з сыноў біблейскага Ноя, і ён аднойчы вельмі непачціва са сваім бацькам абышоўся. Па-хамску, іншымі словамі...

Цікава, што некаторыя абразлівыя словы прыйшлі да нас з французскай мовы.

Слова «шантрапа», напрыклад, зацвердзілася з часоў прыгонных тэатраў, дзе на ролі набіралі сялянскіх дзяцей і моладзь. У час праслухоўвання пра тых, каму мядзведзь на вуха наступіў, казалі «ne shantre pas», што ў перакладзе з французскай азначала «спяваць не можа». Такіх потым адпраўлялі працаваць на кухню, стайню альбо назад да бацькоў, на вясковыя работы. Гэта было куды цяжэй, чым спяваць... А значыць, аказацца «шантрапой» было зусім нават не прэстыжна.

«Шарамыжнікамі» сяляне першапачаткова прazвалі французаў у час вайны 1812 года, калі пры адступленні тыя галадалі і спрабавалі абмяняць свае асабістыя рэчы на прадукты харчавання. «Шэр амі!» (што ў перакладзе азначае «Дарагі сябар!») — звярталіся яны да сялян. Часта пры гэтым французы падманвалі сялян і нават займаліся рабаўніцтвам... Вось адсюль і пайшло зняважальнае слова — «шарамыжнік».

Так што многія з «дрэнных» слоў калісьці вельмі і вельмі прыстойнымі былі. Ці, на крайні выпадак, нейтральнымі...

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

## ДЗЕ СУСТРАКАЮЦЦА ВІЛІЯ І НЯРЫС

**У Вілейскім раёне 9 красавіка адбудзецца міжнародная канферэнцыя «Вілія-Нярыс». Вопыт трансгранічнага супрацоўніцтва». У ёй прымуць удзел навукоўцы з Літвы і Беларусі, прадстаўнікі раёнаў Мінскай і Гродзенскай абласцей, што мяжуюць з суседняй краінай.**

Вілейшчына валодае багатай культурна-гістарычнай спадчынай. У 1857 годзе граф Канстанцін Тышкевіч арганізаваў навуковую экспедыцыю па рацэ Вілія. Па яе выніках у 1871 годзе ў нямецкім Дрэздэне была выдадзена манаграфія «Вілія і яе берагі». А ў 2007-м па ініцыятыве мясцовых краязнаўцаў Віталя Кастэнкі, Анатоля Рогача і Міхаіла Петуха было вырашана прайсці шляхам вядомага даследчыка. З таго часу беларуска-літоўская экспедыцыя ад вытокаў Віліі да Каўнаса ладзіцца штогод. Вілія нясе свае воды ў Балтыйскае мора, каля Каўнаса ўпадае ў Нёман. Літоўцы называюць яе Нярыс.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 80%) по продаже имущества ОАО «Хоневичи»

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот №1** | | |
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение с инв. № 413/С-20736 (здание основного корпуса кирпичного завода), общей площадью 1297,3 кв.м, кирпичное, одноэтажное, 1948 г.п., составные части и принадлежности – пристройка** | | |
| Местонахождение имущества | Гродненская обл., Свислочский р-н, Свислочский с/с, д. 23 около д. Гончары | | |
| Информация о земельном участке | Имущество расположено на земельном участке площадью 1,0 га с кадастровым номером 425282400001000110, назначение – для размещения объектов иного назначения (для обслуживания здания основного производственного корпуса кирпичного завода). Ограничения (обременения) прав: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи (0,1320 га). Имущественные права – право аренды по 02.02.2065 года | | |
| Начальная цена | **113 016 000 рублей с учетом НДС** | **Сумма задатка (10%)** | **11 301 600 рублей** |
| Сведения о продавце | ОАО «Хоневичи», Гродненская обл., Свислочский р-н, а/г Хоневичи, ул. Школьная, 1, тел. 8(01513) 23686 | | |
| Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | **Условия оплаты** | Определяются по согласованию сторон |
| **Торги состоятся 21 апреля 2016 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | **По 15 апреля 2016 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | |
| Дополнительная информация по телефону: 8(0152) 74 49 11 | Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 21.08.2015 г., от 07.10.2015 г., 16.02.2016 г. | | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | | |
| Продавец | **ОАО «Белсантехмонтаж-2», г. Минск, ул. Брилевская, 15** | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| Здание административно-бытового корпуса с гаражами | | 391 кв.м | 612/С-749 | Минская область, г. Жодино, ул. Барсуковская, д. 9 |
| Обременения: аренда части гаража пл. 70,4 кв.м. Срок действия договора – по 30.09.2016 | | | | |
| **Сведения о земельном участке**: Площадь (га) 0,2045. Целевое назначение: Для обслуживания производственной базы филиала «Борисовское монтажное управление». Вид права: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 455 490 000 белорусских рублей (снижена на 10%)** | | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30.01.2016 | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **20.04.2016 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **19.04.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +37517-280-36-37; +375 29-183-69-71; auction@cpo.by; www.cpo.by** | | | |

Страховая организация: Открытое акционерное страховое общество

# «Пенсионные гарантии»

Учетный номер плательщика: 806000061
Вид экономической деятельности: 66010
Организационно-правовая форма: 220
Орган управления: 99000
Единица измерения: тыс. руб.
Адрес: г. Минск, ул. Я. Коласа, 38/16, к. 3
**www.pg-life.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2016 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 1 января 2016 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 74 182 | 118 730 |
| Нематериальные активы | 120 | 52 817 | 65 728 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | – | – |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | – | – |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | – | – |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | – | – |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | – | 21 858 198 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 36 581 330 | 29 593 849 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 160 | 82 800 026 | – |
| Отложенные налоговые активы | 170 | – | – |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | – | – |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **119 508 355** | **51 636 505** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 16 229 | 15 091 |
| в том числе: материалы | 211 | 16 229 | 15 091 |
| незавершенное производство | 212 | – | – |
| прочие запасы | 213 | – | – |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 215 | – | – |
| Расходы будущих периодов | 220 | 11 693 | 4 052 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 230 | 3 546 | 3 546 |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 240 | – | – |
| в том числе: | | | |
| резерв незаработанной премии | 241 | – | – |
| резервы убытков | 242 | – | – |
| другие технические резервы | 243 | – | – |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 31 330 497 | 2 200 929 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 69 659 867 | 55 845 344 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 70 398 535 | 116 895 333 |
| в том числе: касса | 271 | – | – |
| депозитные счета | 272 | 3 957 070 | 12 470 414 |
| эквиваленты денежных средств | 273 | – | – |
| прочие денежные средства | 274 | 66 441 465 | 104 424 919 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | – | – |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **171 420 367** | **174 964 295** |
| **БАЛАНС** | **300** | **290 928 722** | **226 600 800** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 1 января 2016 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 60 000 000 | 9 600 000 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | – | – |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | – | – |
| Резервный капитал | 440 | 870 770 | 870 770 |
| в том числе резервный фонд заработной платы | 441 | – | – |
| Добавочный капитал | 450 | 104 530 | 104 530 |
| в том числе прирост (переоценка) стоимости объектов недвижимости, приобретенных за счет страховых резервов | 451 | – | – |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 61 412 784 | 63 938 119 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | – | – |
| Целевое финансирование | 480 | – | – |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **122 388 084** | **74 513 419** |
| **IV. СТРАХОВЫЕ РЕЗЕРВЫ И ФОНДЫ** | | | |
| Резервы по видам страхования, относящимся к страхованию жизни | 500 | 44 975 107 | 102 900 239 |
| Резерв незаработанной премии | 501 | – | – |
| Резервы убытков | 502 | – | – |
| Другие технические резервы | 503 | – | – |
| Иные страховые резервы | 504 | – | – |
| Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 505 | (15 826) | (70 039) |
| Гарантийные фонды | 506 | (15 434) | (69 887) |
| Иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 507 | – | – |
| **ИТОГО по разделу IV** | **509** | **44 943 847** | **102 760 313** |
| **V. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 71 119 270 | 33 412 103 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | – | – |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 540 | – | – |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | – | – |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | – | – |
| **ИТОГО по разделу V** | **590** | **71 119 270** | **33 412 103** |
| **VI. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | – | – |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | – | – |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 3 184 159 | 15 914 965 |
| в том числе: страхователям | 631 | 77 272 | 14 981 915 |
| страховым агентам и страховым брокерам | 632 | 1 669 | 2 867 |
| прочим кредиторам по операциям страхования, сострахования | 633 | 450 | 450 |
| по операциям перестрахования | 634 | – | – |
| депо премий по рискам, переданным в цперестрахование | 635 | – | – |
| поставщикам и подрядчикам | 636 | – | – |
| по авансам полученным | 637 | – | – |
| по налогам и сборам | 638 | 4 741 | 910 973 |
